Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 126 (4030)
СЕРАДА, 13 МАЯ
1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Парт'ячэйка—арганізатар і кіраўнік

змаганьня калгасаў і саўгасаў за пяршынства

Палявыя работы пачаліся ва ўсіх раёнах БССР. І там, дзе партыйныя арганізацыі сваім правільным і сталым кіраўніцтвам забясьпечылі ўвядзеньне зьдзельшчыны, сталі на чале разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва і на аснове гэтага дабіліся поўнай нагрузкі трактараў і с.-г. машын—саўгасы і калгасы баявымі тэмпамі праводзяць сяўбу, пасьпяхова змагаючыся за скарачэньне не тэрмінаў. Там у рады калгасьнікаў становяцца новыя сотні беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў.

Увядзеньне зьдзельшчыны, правільная арганізацыя работ у калгасах зьявіліся ня толькі магутнымі фактарамі ў **павышэньні прадукцыйнасьці працы** калгасьнікаў, але і лепшым агітатарам за **новы калгасны прыліў. У Паршыскім** сельсавеце (Горацкі раён) у рэзультаце ўвядзеньня зьдзельшчыны лік калгасьнікаў амаль падвоіўся. Там за 9 першых дзён палявых работ уступіла ў калектывы 128 бядняцка-сераднякіх гаспадарак, што даводзіць калектывізацыю сельсавету да 43,9 проц. У **Старобіне** члены калгасу «Працаўнік» сваім гэраічным змаганьнем за выкананьне праграмы другой бальшавіцкай вясны выклікалі ініцыятыву беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў да арганізацыі новага калгасу. Побач з «Працаўніком» вырас «Ударнік». 150 учарайшых аднаасобнікаў калектыўна выехалі на пасеў яравых.

Аналёгічныя прыклады мы маем у **Халопеніцкім** і радзе іншых раёнаў.

Адпак, гэта далёка ня значыць, што тэмпы сяўбы па саўгасах і калгасах **усіх** раёнаў забясьпечваюць пасьпяховае сканчэньне яе ва ўстаноўленыя тэрміны, забясьпечваюць поўнае выкананьне і перавыкананьне вызначаных плянаў. Далёка не! Рад калгасаў і саўгасаў некаторых раёнаў надзвычай вяла і марудна разгортваюць палявыя работы, ганебна адстаюць у сваячасовым выкананьні праграмы. У калгасе **«Бальшавік»**, напрыклад (Койданаўскі раён), нават няма яшчэ вытворчых плянаў палявых работ. У калгасах **«Новая праца» і «Х зьезд саветаў»** калгасьнікі не падзелены на брыгады, не ліквідавана абязьлічка, якасьць палявых работ вельмі нізкая. Памяшёныя калгасы аныпуліся ў такім становішчы **толькі ў рэзультаце недапушчальна слабога кіраўніцтва імі з боку партыйных ячэек, толькі таму, што сярод калгасьнікаў не разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва.**

Задачы пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы (поўнае выкананьне намечаных праграм, упчыльненьне тэрмінаў і г. д.) патрабуюць высокіх і напружаных тэмпаў ад кожнага саўгасу, калгасу і МТС, ад кожнага сельска-гаспадарчага рабочага і калгасьніка. Гэтых тэмпаў саўгасы, МТС і калгасы даб'юцца **толькі на аснове разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва, толькі праз змаганьне за пяршынства.**

Пастановай ЦК КП(б)Б, якая зьмешчана ва ўчарайшым нумары «Зьвязды», абвешчан **агляд разгортваньня сяўбы і сацспаборніцтва паміж калгасамі, саўгасамі, МТС і раёнамі, спаборніцтва паміж рабочымі саўгасаў, паміж калгасьнікамі.** ЦК устанавіў выдачу пераходных сьцягаў імя ЦК КП(б)Б, ЦВК, Калгасцэнтру, ЦСПСБ, газэт: «Зьвязда», «Савецкая Беларусь», «Рабочий», «Чырвоная зьмена», «Акцябр», «Калгасьнік Беларусі», «Орка» і паасобных прафсаюзаў тым калгасам, саўгасам, МТС і раёнам, якія найбольш арганізавана, з найбольшымі якаснымі і колькаснымі паказальнікамі ў выкананьні плянаў, і ў найкарацейшыя тэрміны правядуць сяўбу.

Правядзеньне конкурсу ставіць перад партыйнымі арганізацыямі і ячэйкамі саўгасаў і калгасаў рад адказьнейшых задач. **Парт'ячэйкі павінны быць арганізатарамі і кіраўнікамі змаганьня калгасаў, саўгасаў і МТС за пяршынства ў правядзеньні веснавой сяўбы.** Масы камуністаў і камсамольцаў сельска-гаспадарчых рабочых і калгасьнікаў павінны ісьці ў авангардзе гэтага змаганьня. Папулярызацыя задач і значэньня конкурсу—першарадная задача кожнай райпартарганізацыі і ячэйкі. Пастанова ЦК КП(б)Б і апублікаваныя ўчора ў «Зьвязьдзе» ўмовы конкурсу павінны быць ня толькі прадметам шырокага абмеркаваньня на ячэйках і сходах калгасьнікаў, а павінны быць даведзены да кожнае брыгады, да кожнага рабочага саўгасу і МТС, да кожнага калгасьніка.

Парт'ячэйкі павінны забясьпечыць, каб усе бяз выключэньня саўгасы і калгасы бралі ўдзел у конкурсе, у змаганьні за пяршынства. Гэта мы падкрэсьліваем таму, што ў радзе калгасаў і саўгасаў знойдуцца ня толькі радавыя работнікі, а нават асобныя кіраўнікі, якія, не разумеючы задач конкурсу, будуць лічыць неабавязковым удзел сваіх калгасаў у змаганьні за пяршынства («няхай, моў, удзельнічаюць у конкурсе перадавыя, мы ўсё роўна наперад ня выйдзем»). Такім па сутнасьці апартуністычным настроям парт'ячэйкі павінны даць бязьлітасны бой.

Правядзеньне конкурсу павінна зьявіцца магутным фактарам у разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва паміж асобнымі брыгадамі сельска-гаспадарчых рабочых і калгасьнікаў, у разгортваньні індывідуальнага спаборніцтва. Лепшым брыгадам, перадавым змагаром за бальшавіцкую сяўбу сельска-гаспадарчым рабочым і калгасьнікам будуць выданы прэміі. Праграмы конкурсу даюць поўны пералік тых канкрэтных пытаньняў, вакол якіх разгортваецца змаганьне за пяршынства.

Мабілізаваць масы калгасьнікаў вакол праграмы конкурсу, вакол задач змаганьня за пяршынства ў веснавой сяўбе немагчыма без разгортваньня палітычна-масавай работы. Палітычна-масавая работа ў ажыцьцяўленьні намечаных плянаў сяўбы адыгрывае адну з рашаючых роляй. Між тым у радзе калгасаў яна ня толькі не разгорнута, а нават не пачата. Трэба забясьпечыць, каб хаты-чытальні, чырвоныя куткі ўсю сваю работу падначалілі задачам веснавой сяўбы, задачам разгортваньня калектывізацыі і наступленьня на кулацтва да поўнай яго ліквідацыі, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Асабліва адказныя задачы пры правядзеньні конкурсу выпадаюць на **нізавы і раённы друк.** Раённыя, калгасныя і насьценныя газэты павінны зьявіцца арганізатарамі мас вакол задач правядзеньня конкурсу, наіўхільна павышаючы сваю ролю ў змаганьні за пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы, тым больш, што рад газэт невыстарчальна мабілізуе масы на ўшчыльненьне тэрмінаў сяўбы, на поўнае выкананьне намечаных плянаў.

Змаганьне за пяршынства ў веснавой сяўбе павінна яшчэ больш павысіць палітычную сьвядомасьць найшырэйшых калгасных мас, узьняць іх баяздольнасьць у барацьбе за выкананьне праграмы 3-га году пяцігодкі, па правядзеньні сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Оргія крывавых пагромаў працоўных у ЗАХ. БЕЛАРУСІ І ЗАХ. УКРАІНЕ

Польскі фашызм імкнецца да фізычнага зьнішчэньня камуністычнага авангарду рабочай клясы і працоўнага сялянства

За адказы на украінскай мове арыштаваных секлі шаблямі

Украінскі клюб польскага сойму зьвярнуўся да міністраў унутраных спраў і юстыцыі з запытаньнем аб зьверствах польскіх паліцэйскіх у вёсках **Кржыве, Саранчукі, Ліціяцін і Лапшын,** Бржэзянскага павету. У інтэрпляцыі падаюцца абураючыя факты зьдзекаў польскіх паліцэйскіх.

21-га лістапада мінулага году ў 4 гадзіны раніцы ў вёску **Кржыву** прыбыў карны атрад у складзе 75 паліцэйскіх. Вось кароткі пералік іх «дзейнасьці»: **разгромлена хата-чытальня «Просьвіта», разгромлен народны дом, зьнішчана бібліятэка ў 1.100 тамоў, разгромлен мясцовы калпэратыў і зьнішчаны ўсе тавары.** Пераграбаны ўсе дамы ў вёсцы, прычым у часе вобыскаў **пагалоўна зьбівалі ўсіх жыхароў, уключаючы і жанчын.** Студэнт **Міхась Голас** зьбіты да страты прытомнасьці бізунамі і прыкладамі.

У часе вобыскаў паліцэйскія раськідвалі сьпірты з хлебам і саломенныя стрэхі дамоў. Вёска ў якасьці **кантрыбуцыі** павінна была даць паліцэйскім **400 штук яек, 75 літраў малака, 35 булак хлеба і г. д.**

2-га кастрычніка ў вёску прыбыў атрад сьледчай паліцыі, які, разьмясьціўшыся самавольна ў памяшканьні «Просьвіты», наладзіў тут-жа і арыштны дом, куды была сагнана вялікая колькасьць сялян, арыштаваных, як у Кржыве, так і ў ваколічных вёсках. У часе допытаў арыштаваных **за адказы на іх роднай украінскай мове зьбівалі кулакамі, шаблямі, білі па твары, ставілі на калені і г. д.** Селяніна **Валашчука,** якога падазравалі ў прыналежнасьці да УВА (украінская вайсковая арганізацыя) падвергалі жорсткім сярэднявяковым катаваньням—**білі па палавых органах, памалі пальцы ног, білі гапавой аб сьценку, перакідвалі ад аднаго паліцэйскага да другога, як мячык.** «Допытвалі» Валашчука такім чынам **6 дзён.** Атрад сьледчай паліцыі «паводзіў» парадкі ў Кржыве да 10-га сьнежня. За гэты час было **зьбіта каля 100 чал., з іх 24 былі адпраўлены ў Бржэзянскую турму,** адкуль зараз амаль усе выпушчаны з прычыны **адсутнасьці якой-бы там ні было віны. Некаторыя арыштаваныя былі проста расстраляны і г. д.**

Сьцяпан Ляшчук так апісвае свае перажываньні: «.-г. лістапада прывялі мяне ў памяшканьне, дзе знаходзіліся агенты і паліцэйскія. Калі я на іх пытаньне адказаў, што нічога ня ведаю і не адчуваю за сабою ніякай віны, паліцэйскія **Маеўскі, Пастэрак і Наглер** кінуліся на мяне і пачалі біць кулакамі і прыкладамі, таптаць нагамі, душыць за горла, рваць валасы. Потым Маеўскі схапіў мяне за галаву, заціснуў яе паміж сваіх ног, а Пастэрак і Наглер білі па почках. Праз некаторы час катаваньні былі спынены, мяне паставілі ў кут і загадалі прызнавацца. Я заявіў, што нічога ня ведаю і прашу лепш забіць мяне, чым так зьдзекавацца. Паліцэйскі Врубель адказаў мне, што **сьмерць праз расстрэл або пракол штыхом была-б занадта лёгкай і для таго, каб я паміраў марудна, мне адаб'юць почкі і ўнутранасьці...** На наступны дзень мяне катавалі далей, прычым Маеўскі моцным ударам у твар **выбіў мне ўсе зубы».**

Хворы на запаленьне легкіх **Мікола Трафімяк** так апісвае свой допыт: «2-га сьнежня 1930 г. у 8 гадз. раніцы выклікалі мяне на допыт у «Прасьвіту». Там прысутнічалі: тайны агент Врубель, Маеўскі і два паліцэйскія. З прычыны таго, што на пастаўленыя мне пытаньні я ня мог адказаць станоўча, дык Врубель загадаў мне разьдзецца і потым разам з Маеўскім, ня лічачыся з маёй хваробай, пачалі біць на твары так моцна, што я ўпаў на падлогу. Маеўскі, падняўшы мяне з падлогі, расьцягнуў мне марышарку і камізэльку і пры агідненьшай лаянцы пачалі мяне зьбіваць: **білі мяне кулакамі ў грудзі, у жывот, у почкі, пад рэбры, гапавой аб сьцену, білі да страты прытомнасьці.** Потым аблілі мяне вадой і **пачалі біць зноў. Білі ад 8 гадз. раніцы да 1 гадз. дня. За гэты час я трацію прытомнасьць тры разы».**

10-га сьнежня атрад сьледчай паліцыі перабраўся ў вёску Саранчукі. Там паліцэйскія дзейнічалі такім-жа чынам, як і ў Кржыве. Адзін з зьбіваемых, ня выцерпеўшы зьдзекаў, павесіўся ў турме. Будучы ў Саранчуках, паліцэйскія зьбівалі таксама сялян вёсак **Катова, Пасухова, Патутара і Жулновэк.**

Потым атрад пераехаў спачатку ў вёску Ліціяцін і 20-га сакавіка 1931 г. прыбыў у вёску Лапшын. Катаваньні ня спыняюцца. Арыштаваных прымушалі падпісваць вымышаныя прызнаньні. Калі арыштаваныя, якія пакіроўваліся ў Бржэзянскую турму, адмовіліся ад сваіх паказаньняў, як вымушаных катаваньнямі, дык **іх папярэдзілі, што іх зноў «запросяць на допыт»** (ТАСС).

«Ударная брыгада» польскага фашызму

Пратэст мільёнаў

Супроць карных экспэдыцый, супроць крывавага пагрому азьвярэлай паліцэйшчыны на акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіне

У надзвычай цяжкіх умовах эканамічнага крызісу, ва ўмовах жорсткага фашысцкага терору і шалёнага наступленьня капіталу на жыцьцёвыя ўмовы рабочае клясы прыходзіцца працоўным усіх капіталістычных краін, калёніяльных і паўкалёніяльных краін змагацца за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне.

Вялізарныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, у краіне, дзе поўнасьцю ліквідавана беспрацоўе, дзе шпаркім тэмпам узьнімаецца культурны і матар'яльны ўзровень рабочае клясы, калгасьнікаў і працоўнага сялянства,—выразна паказваюць рабочай клясе і працоўным усяго сьвету, што адзіным шляхам вызваленьня з-пад уціску эксплёатацыі і фашысцкага терору зьяўляецца дыктатура пралетарыяту.

Міжнародныя імпэрыялістычныя дрэпежнікі, імкнучыся выратаваць гінучую капіталістычную сыстэму, шалёнымі тэмпамі рыхтуюцца да ўзброенай інтэрвэнцыі супроць адзінай у сьвеце краіны Саветаў, разьлічваючы шляхам закабаленьня вольных народаў Савецкага Саюзу павялічыць свае капіталістычныя прыбыткі.

Адным з галоўнейшых перадавых атрадаў міжнароднай інтэрвэнцыі зьяўляецца фашысцкая Польшча. Зьдыхаючыся ў ціскох вострага эканамічнага крызісу, імпэрыялістычная Польшча ўзмацніла да нячуваных разьмераў калёніяльную эксплёатацыю працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Вядучы ліхаманкавую падрыхтоўку да ўзброенага нападу на СССР, польскі фашызм шляхам жорсткага задушэньня нацыянальна-вызваленчага руху працоўных мас ЗБ і ЗУ імкнецца падрыхтаваць сабе спакойны тыл і надзейны плацдарм для ваенных дзеяньняў.

Шалёны разгул фашысцкага тэрору на акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіне ня мае сабе роўнага ва ўсёй гісторыі чалавецтва. Самыя страшэнныя катаваньні сярэднявяковай гішпанскай інквізыцыі блядняюць перад тэрорам, які праводзіцца беларускімі акупантамі і над беларускімі і украінскімі працоўнымі масамі.

Шалёны фашысцкі тэрор павялічваецца роўнаважна з тэмпамі падрыхтоўкі ўзброенай інтэрвэнцыі. Разгром беларускага рабоча-сялянскага клюбу «Змаганьне», разгром ТБШ, усіх культурна-асьветных і каапэрацыйных устаноў, правакацыйны арышт правадыра Грамады тав. Тарашкевіча, задушэньне радыкальнай прэсы, разгром ППС-дзявіцы і новыя масавыя арышты ў Сьвянцянцкім—вось крывавы шлях фашысцкіх катаў на акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіне.

Натхніцелямі гэтай жудаснай крывавай оргіі фашызму зьяўляюцца беларускія нацыянал-фашысты з Луцкевічам, Астроўскім і Акінчыцам на чале.

Трэці ўсебеларускі зьезд чыгуначнікаў узьнімае свой рашучы голас пратэсту супроць зьверскага тэрору фашысцкіх катаў у Зах. Беларусі і Зах. Украіне.

У адказ на спробы інтэрвэнтаў і сацыял і нацыянал-фашыстаў задушыць першую ў сьвеце бацькаўшчыну рабочых мы яшчэ больш узмоцнім ваенную працу, каб даць зьнішчальны адпор інтэрвантам, калі яны адважацца напасьці на краіну Саветаў.

Мы, дэлегаты, прыехаўшы на месца, зараз-жа пачнем ажыцьцяўляць вопыт харкаўскага заводу «ГЭЗ» імя Сталіна па інтэрнацыянальнай сувязі, каб дапамагчы замежным рабочым як матар'яльна, так і маральна ў іх рэвалюцыйнай барацьбе супроць капіталу і эксплёатацыі сацыял і нацыянал-фашыстаў.

Зьезд абяцае аддаць усе сілы на разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва для ліквідацыі прарываў.

Няхай жыве Камінтэрн—штаб сусьветнай рэвалюцыі!

Рэзалюцыі пратэсту супроць зьверскіх катаваньняў і шалёнага тэрору ў Зах. Беларусі і Зах. Украіне наступаюць бязупынна ў рэдакцыю. Рабочыя і служачыя, калгасьнікі і працоўнае сялянства, ухваляючы рэзалюцыю пратэсту, адначасова ўносяць грашовыя сродкі на дапамогу палонным капіталу і іх сем'ям. Так, **рабочыя саўгасу і сяляне вёсні Пакрашова ўносяць 22 руб. 50 кап. на дапамогу палітзьняволеным фашысцкай Польшчы.**

Агульны сход рабочых і служачых Крычаўскага фасфарытнага заводу на тэрор польскай паліцэйшчыны на акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіны **адказвае стопроцантным уступленьнем у рады МОПР'у.**

Калгасьнікі калгасу «Серп і молат», Глускага раёну, адначасова з рэзалюцыяй пратэсту супроць крывавага тэрору польскага фашызму **ўносяць на дапамогу палітзьняволеным 185 руб. і акрамя таго пастанавілі правесьці два нядзельнікі па вывазцы лесу ў** [illegible] **рысьць палітзьняволеных і выкінуць усе калгасы Глускага раёну.**

Працоўныя Лядкянскага раёну ў [illegible] **каз на крывавыя оргіі польскага фашызму ў Зах. Украіне і Зах. Беларусі выканалі плян зімовай дапамогі палітзьняволеным на 300 проц., сабраўшы звыш 400 руб.** Рэзалюцыі пратэсту атрыманы ад **працоўных мястэчка** [illegible] **рыя Дарогі і ад вучняў 2-га канцэрту** [illegible] **Ельскай ШКМ.**

Посьпехі чэхаславацкай кампартыі ў перавыбарах фабзаўкомаў

ПРАГА, 6. Перавыбары фабзаўкомаў, якія адбываліся ў апошнія дні ў многіх раёнах краіны, **закончыліся перамогай камуністаў.** Усюды назіраецца значнае папярэдненьне мас і іх адыход ад сацыял-фашысцкіх арганізацый.

У некаторых мясцох сац. фашыстам яшчэ ўдасца стварыць відавочнасьць посьпеху, але гэта тлумачыцца выключна тэрорам, які яны застосоўваюць у адносінах да рабочых. Пры перавыбарах заўкомаў на ваенных **заводах Шкода** і **Пільзэне** камуністы атрымалі адзін новы мандат, у той час, як сацыял-дэмакраты адзін мандат страцілі.

Ня меншую перамогу атрымалі чырвоныя прафсаюзы на ўчарашніх перавыбарах заўкому на буйным мэталазаводзе «Праскае мэталюргічнае акцыянэрнае таварыства» ў **Кладно.** На гэтым заводзе камуністы сабралі **1.260 галасоў (6 мандатаў),** супроць **1.072 галасоў (5 мандатаў)** у мінулым годзе. Сацыял-дэмакраты, ня гледзячы на тое, што яны выступалі на гэтым заводзе ў блёку з ліквідатарамі, атрымалі толькі **688 галасоў (4 мандаты)** супроць **829 галасоў** у мінулым годзе (ліквідатары ў 1930 г. атрымалі 312 галасоў).

Перавыбары заўкомаў на Праскім канцыльным заводзе таксама сьведчаць аб росьце ўплыву кампартыі. Камуністы атрымалі адзін новы мандат у заўкоме, у той час як нацыянал-сацыялісты страцілі адзін мандат, а сац.-дэмакраты захавалі ранейшую колькасьць мандатаў. (ТАСС).

ТОЛЬКІ РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ БАРАЦЬБА МІЛЬЁНАЎ ПРЫВЯДЗЕ ДА ПЕРАМОГІ

СУПРОЦЬ БРЫТАНСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ, СУПРОЦЬ ІНДЫЙСКІХ КАПІТАЛІСТАЎ І АБШАРНІКАЎ

АДОЗВА КАМПАРТЫІ ІНДЫІ

СТАМБУЛ. З Індыі паведамляюць, што ў сувязі з сэсіяй нацыянальнага кангрэсу ў Карачы індыйская камуністычная партыя выпусьціла адозву, якая **выкрывае здрадніцкую ролю нацыянальнага кангрэсу і заклікае да рэвалюцыйнай барацьбы супроць ангельскага імпэрыялізму, за поўную незалежнасьць Індыі.**

Адзначаючы, што, заключыўшы згоду з віцэ-каралём Індыі, Гандзі зноў здраджаў шматмільённым масам рабочых і сялян, адозва падкрэсьлівае, што мэта **у** ангда-індыйскай канфэрэнцыі «кругнага стала» дагэтага, каб сумесна з імпэрыялістамі ўхваліць новы плян эксплёатацыі працоўных мас Індыі.

«Каб дапамагчы ажыцьцяўленьню гэтага пляну, **каб атрымаць сваю долю ў эксплёатацыі Індыі** пры дапамозе брытанскага капіталу, нацыянальны кангрэс зноў здраджвае рух мас і заключыў блёк з брытанскімі капіталістамі супроць працоўных Індыі».

Выкрываючы здрадніцкія маневры нацыянальнага кангрэсу, адозва паказвае: «Перамога над брытанскімі прыгнальнікамі можа быць дасягнута не мабілізацыяй соцень добраахвотнікаў, а толькі **ўзьняцьцем на барацьбу мільёнаў,** у асаблівасьці сялян, якія пакуль яшчэ не арганізаваны. Перамога над брытанскім імпэрыялізмам можа быць дасягнута ня шляхам адводу руху мас у бок саляных паходаў, а толькі шляхам канцэнтрацыі барацьбы ў цэнтрах, раней усяго ў буйных гарадох, дзе знаходзяцца жыцьцёвыя нэрвы імпэрыялізму. Гэта перамога можа быць дасягнута ня шляхам пасыўных цэрпялівых адносін да ўдараў паліцэйскіх лаці (бамбукавыя дубінкі), а **захопам зброі прыгнятальнікаў і накіраваньнем яе супроць іх-жа.** Перамога магчыма ня шляхам гэраічных, але бескарысных тэрарыстычных замахаў, якія робяцца адзінкамі, ня зьвязанымі з масамі, а **арганізаваным рэвалюцыйным рухам саміх мас.**

У заключэньне партыя зьвяртаецца да індыйскіх рабочых і сялян і да ўсіх рэвалюцыйных элемэнтаў гораду і вёскі з заклікам да барацьбы: 1) **за поўную незалежнасьць краіны** шляхам рэвалюцыйнай барацьбы супроць імпэрыялізму; 2) **за канфіскацыю зямель ураду і яго агентаў** — зэмындараў, буйных зямельных уласьнікаў, ліхвяроў і прамыслоўцаў, за ануляваньне ўсіх відаў арэндных платы і запазычанасьці сялян; 3) **за канфіскацыю фабрык і заводаў,** банкаў, чыгунак і іншых прадпрыемстваў, якія належаць імпэрыялістам і буржуазіі, якая падтрымлівала іх, за ануляваньне ўсіх дзяржаўных даўгоў імпэрыялістам; 4) **за 8-гадзінны рабочы дзень,** увядзеньне сацыяльнага страхаваньня, роўную аплату роўнае працы бяз розьніцы расы ці полу, за свабоду руху, сходаў, арганізацый забастовак і дэманстрацый, а таксама за поўнае прызнаньне правоў прафсаюзаў; 5) **за скасаваньне ўсіх каставых, рэлігійных і нацыянальных прывілеяў,** за ўстанаўленьне поўнае роўнасьці бяз розьніцы расы, касты, полу ці рэлігіі; 6) за бязумоўнае **вызваленьне ўсіх палітычных зьняволеных».**

Адкрыўся зьезд Бэльгійскай кампартыі

Барацьба з пагрозай Інтэрвэнцыі супроць СССР— у цэнтры ўвагі

ПАРЫЖ, 10. Паводле паведамленьня з Брусэля, учора ў Сэрэне адкрыўся зьезд бэльгійскай кампартыі. У апублікаванай падрабязнай справаздачы, якая прадстаўлена зьезду Цэнтральным Камітэтам партыі, ЦК спыняецца, перш за ўсё, на абвастрэньні эканамічнага крызісу ў Бэльгіі.

У цяжкай прамысловасьці скарачэньне прадукцыі дасягнула **30-40 проц.,** ва ўгольнай прамысловасьці запасы вугалю дасягаюць да **3 млн. тон.** Зьніжэньне звароту ўнутранога гандлю складае **20 проц.,** біржавой эмісіі—**60 проц.** Лік беспрацоўных павялічыўся да **400.000** з агульнага ліку у 1.850.000 рабочых.

Становішча рабочых мас **бязупынна багаршаецца.** Зьніжэньне зарплаты за апошнія месяцы даходзіць у сярэднім да **15-20 проц.,** а ў некаторых выпадках нават **30-40 проц.** Рабочы дзень павялічваецца. Супроць сацыяльнага страхаваньня видзецца арганізаваны паход. Падатковы цяжар расьце. За апошнія 4 гады ваенны бюджэт узрос удвая. Адначасова абвастраецца аграрны крызіс і расьце зьбядненьне сялянскіх мас.

Далей у справаздачы адзначаецца барацьба фламандцаў за сваё нацыянальнае вызваленьне, а таксама нацыянальная барацьба рабоча-сялянскіх мас рабу Эйпэн-Мальмэдзі, адзначаны рост класавай барацьбы ў Бэльгійскім Конго, **паўмільённа нападога туземнага пралетарыяту перавышае горшыя прыклады на пёніяльнага барбарства.** Рабочыя масы Конго прыступаюць да стварэньня прафэсіянальных арганізацый. Рост гэтага руху яшчэ больш абвастрае ўсё супярэчнасьці бэльгійскага імпэрыялізму.

Асаблівую ўвагу справаздача аддае розлі сацыял-рэфармізму. Зрастаньне рэфармісцкіх правадыроў з дзяржаўным апаратам і капіталістычнымі органамі дасягае нябывалых у другіх краінах разьмераў. Гэта зьява знаходзіць сваё выражэньне ў сацыял-імпэрыялізьме і сацыял-фашызьме.

Пераходзячы затым да задач кампартыі, **справаздача падаяргае грунтоўнай, суровай крытыцы слабасьць яе работы.** Слабая сувязь партыі з масамі. Кіраўніцтва забастовачнай барацьбой абмяжоўвецца агітпрапаработай, якая ня ўкіраўляецца з арганізацыйнай падрыхтоўкай. Рэвалюцыйная прафпаазыцыя аказваецца слабая дапамога.

Адзначаючы рад станоўчых бакоў у рабоце партыі за апошні час (удзел у забастоўках, скліканьне шырокіх рабочых канфэрэнцый, некаторы паварот у бок рэарганізацыі партыі на аснове водзкіх ячэек, некаторы рост тыража прэсы і г. д.), справаздача ставіць перад партыяй задачы полепшэньне кіраўніцтва барацьбой рабочых мас, умацаваньне рэвалюцыйнай прафпаазыцыі, умацаваньне работы на прадпрыемствах, у прыватнасьці шляхам стварэньня заводзкіх ячэек, ажыцьцяўленьне адзінага фронту барацьбы супроць сацыял-рэфармізму і апартунізму, а таксама з «лявіцкімі» загібамі ўнутры партыі, барацьба з імпэрыялізмам і з пагрозай інтэрвэнцыі супроць СССР, абарона нацыянальных патрабаваньняў фламандцаў і працоўных мас Эйпэн-Мальмэдзі.

У заключэньне справаздача падкрэсьлівае неабходнасьць узмацненьня камуністычнага друку, выхаваўчай работы ўнутры партыі і шырокай агітацыйнай работы сярод рабочых масах. (ТАСС).

ЖЫВЫ ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ У БАЎГАРСКАЙ БЁСЦЫ

ВЕНА, 6. З Сафіі паведамляюць аб свяцасаблівай першамайскай дэманстрацыі, якая адбылася ў Паўднёвай Баўгарыі ў **вёсцы Батан.** У вёсцы, дзе паліцыяй былі забаронены першамайскія сходы і дэманстрацыі, рэвалюцыйныя сяляне афарбавалі белага бусла ў чырвоны колер, зрабіўшы такім чынам «ляталучы чырвоны сьцяг». Вялікі натоўп наглядаў за «чырвоным дэманстрантам», які пад бурнае адабраньне гляданчоў усеўся на комін паліцэйскага камісарыяту. Паліцыя дарма прабавала зьлавіць гэты жывы чырвоны сьцяг.

Развал капіталізму паглыбляецца

З нябывалай вострасьцю выяўляюцца супярэчнасьці паміж сыстэмай загніваючага капіталізму і сыстэмай сацыялізм

Расьце пагроза інтэрвэнцыі супроць СССР

Судаклад сакратара ЦК КПП т. Ленскага на XI пленуме ВККІ*)

Польская буржуазія ў тупіку крызісу

Польшча, як адно з найбольш слабых зьвяньняў капіталістычнай сыстэмы, зьяўляецца краінай, у якой асабліва яркі выступае як усеагульны пасьляваенны крызіс капіталізму, так і цяперашні эканамічны крызіс, які разьвіваецца на яго грунце.

Што-ж робіць фашысцкі ўрад для зьмяншэньня крызісу? Яго актуальная праграма ў гэтых адносінах зводзіцца да **трох** пунктаў: новыя замежныя пазыкі, захаваньне актыўнасьці або прынамсі, роўнавагі гандлёвага балянсу, авужэньне ножніц паміж цэнамі на прамысловыя і сельска-гаспадарчыя прадукты.

Першы пункт — па думцы ўраду — зьяўляецца ращаючым. Аднак, прыліў замежных капіталаў адбываецца ў вельмі абмежаваным размеры, ня кажучы ўжо аб ліхвярскіх умовах.

Намаганьні фашысцкага ўраду захаваць роўнавагу гандлёвага балянсу пры дапамозе краннята пратэкцыянізму маталкуюцца на рэакцыю падзеньне вартасьці экспарту і ўзрастаючую процідзейнасьць іншых капіталістычных краін.

Польская буржуазія апынулася ў тупіку. Надзвычай моцны аграрны крызіс, крайняя паўпярэрызацыя сялянскіх мас, значнае адставаньне ў канкурэнцыйнай барацьбе за рынкі збыту, недахват уласных капіталаў і слабы прыліў замежных капіталаў пры праявлэнай чарнатраўнасьці фашысцкага рэжыму — усе гэты фактары надзвычай звужаюць магчымасьці аслабленьня эканамічнага крызісу, хаця не выключаюць часткових паляпшэньняў канюнктуры на пасобных вучастках гаспадарчага жыцьця.

Наступленьне капіталу і рэвалюцыйны ўздым

Наступленьне капіталу на працоўныя масы, замаруджанае на тактычных меркаваньнях у пэрыяд сойміных выбараў, праводзіцца за апошнія месяцы шалёным тэмпам. Новая атака, накіраваная літаральна на усе галіны жыцьця рабочае клясы і эксплёатаванага сялянства мае франтальны, месцамі-ж абходны, маневравы характар.

Жабрацкія заработкі прамысловых рабочых, большасьць якіх працуе няпоўнымі тыдзень, фабрыканты прабуюць зноў урэзаць **на 10-40 проц.** У дзяржаўных прадпрыемствах заработная плата ў канцы мінулага году зьнізана на 10-15 проц. На цэлым радзе фабрык (у Лодзі, Вельску, Прыморскай вобласьці) заработная плата ўжо **зьнижана на 7-20 проц.** У найгоршым становішчы знаходзяцца сельска-гаспадарчыя рабочыя, агульная лічба якіх разам з сезоннікамі і лясьнымі рабочымі дасягае 1.800 тыс. і якія атрымліваюць у сярэднім па 2-3 злотых у дзень.

Зусім распачлівае становішча соцень тысяч беспрацоўных. З 370 тысяч зарэгістраваных беспрацоўных толькі 120 тысяч атрымліваюць дапамогу ў разьмерах 30 проц. ад зарплаты на працягу 17 тыдняў. Каля мільёну беспрацоўных прамысловых і сельска-гаспадарчых рабочых пазбаўлены ўсякай дапамогі.

Новае наступленьне капіталу на рабочую клясу цесна зьвязана з пазбаўленьнем яе легальных магчымасьцяй барацьбы.

Тэрор, які ўзмацняецца са дня ў дзень, усё мацней б'е ня толькі па рэвалюцыйным авангардзе, але і па шырокіх масах пралетарыяту і сялянства. **Карныя экспэдыцыі ўводзяцца ў сыстэму** і перакідваюцца на карэнную Польшчу, як паказ ход соймавых выбараў. Сыстэма «пацыфікацыі» — гэта новая рыса ў разьвіцьці фашысцкага тэрору. Зьверскія зьдзекі і катаваньні становяцца штодзённым зьявішчам.

У гэтых умовах ращаючым элемэнтам радыкалізацыі мас становіцца іх **адпор** атакам капіталу, іх узрастаючая процідзейнасьць фашысцкаму тэрору, якая паступова пераходзіць у рэвалюцыйны **напор** супроць усяго рэжыму фашысцкай дыктатуры.

Апошнія месяцы вызначаліся нарастаньнем **забастовачнай хвалі.** Большасьць забастовак адзначалася надзвычайнай упартасьцю і вострасьцю. Рад забастовак, якія пачаліся з барацьбы супроць зьніжэньня зарплаты, выліўся ў дэманстрацыі пратэсту супроць арыштаў, у крывавыя сутычкі з паліцыяй і нападзеньні на фабрычную дырэкцыю і г. д.

Формы забастовачнай барацьбы вельмі рознастайныя, пачынаючы з італьянскай забастоўкі да захвату фабрык і масавых штурмавых выступленьняў рабочых, прычым адна форма пераходзіць у другую.

За апошнія месяцы партыя кіравала большасьцю эканамічных забастовак, узмацніўшы свой уплыў сярод рабочых буйной прамысловасьці.

Рух беспрацоўных узьняўся на больш высокі ўзровень, зьяўляючыся першачарговым фактарам расхістаньня фашысцкай дыктатуры. Значна ўзмацніўся ў ім кіруючая роля кампартыі.

Ня менш востра выступаюць **сымптомы рэвалюцыйнага ўздыму ў вёсцы.** Хаця ў ім да гэтага часу пераважаюць элемэнты стыхійнасьці, аднак, і тут арганізацыйная роля кампартыі і яе масавых прывадных пасаў павялічылася. Найбольшую актыўнасьць праяўляе сялянская бяднота, вядучы за сабой зруйнаваныя масы сераднятства. Вельмі слабо рэагуюць на падзеі с.-г. рабочыя, сярод якіх партыя яшчэ ня здолела знайсьці сабе трывалую апору. Сельска-гаспадарчы пралетарыят на даным этапе вельмі адстае ад аснoўных мас сялянства.

На агульных сходах сяляне пачын

З 22-х торфазаводаў працуюць 9

Сэзон па здабычы торфу разгортваецца вельмі марудна

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб рабоце тарфяной прамысловасьці ня выконваецца

Заводы-спажыўцы! Нападзім вытворчае шэфства над торфзаводамі. Дапаможам тарфяной прамысловасьці выканаць адказныя задачы па ператварэньні БССР у тарфяны Данбас!

Узяць бальшавіцкія тэмпы!

Сэзон па [illegible] торфу на торфазаводах БССР разгортваецца вельмі марудна. На гледзячы на зусім выразную дырэкыву пачаць сэзон не пазьней 5 мая, да сёньняшняга дня да работы прыступіла толькі 9 ПРАДПРЫЕМСТВАЎ З 22-х, або каля 41 проц. Яшчэ меншы процант машын, якія пушчаны у ход. Працуе пакуль 26 машын з 74-х, [illegible] 35 ПРОЦ. Нават улічваючы цяжкія кліматычныя ўмовы гэтай вясны, трэба сказаць, што ПРАРЫЎ У ПАЧАТКУ РАБОТ УСЁ-ЖЕ ВЕЛЬМІ ВЯЛІКІ. Прычым, недапушчальна марудна разгортваецца сэзон якраз на найбольш БУЙНЫХ торфазаводах. [illegible] ТОРФЕ становіцца больш-менш здавальняючае: там з 12-ці машын працуе 11. Затое на заводзе «ШЛЯХ САЦЫЯЛІЗМУ» (Добруш) з 7 машын пачалі работу толькі 2, на заводзе ІМЯ 1 МАЯ (Чашнікі) з 5 машын працуюць 3, на заводзе «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» (Барысаў) з 4 машын—толькі 1. На такіх буйнейшых прадпрыемствах, як «ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ» (Магілеў) «КАЛЕКТЫЎНАЯ ПРАЦА» (Крычаў), «БАЛЬШАВІК» (Гомель), якія маюць праграму парадку 30-40 тыс. тон, ДА ЗДАБЫЧЫ ТОРФУ ЯШЧЭ НЯ ПРЫСТУПЛЕНА.

Усё гэта ня можа ня выклікаць сур'ёзнай трывогі за пасьпяховае выкананьне пляну торфаздабычы. Яшчэ больш трывогі выклікае той факт, што заводы прымушаны пакуль разгарнуць работу выключна на старых фармовачных машынах, З 20-ці ФРЭЗЭРНЫХ МАШЫН, якія павінен быў атрымаць Белторф, АТРЫМАНЫ ТОЛЬКІ 2. Гэта ставіць пад пагрозу выкананьне ня толькі кольвасных, але і ЯКАСНЫХ паказальнікаў прамфінпляну па торфе, паколькі фрэзэрная здабыча торфу значна больш эканомная і дае большую прадукцыйнасьць. Тым больш, што прамфінплян прадугледжвае здабыць фрэзэрным спосабам каля 30 ПРОЦ. УСЯГО ЗАДАНЬНЯ.

Асноўнымі прычынамі недапушчальна маруднага разгортваньня торфасэзону выяўляюцца тыя элементы САМАЦЕКУ, аб якіх даволі выразна сказала бюро ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб рабоце тарфяной прамысловасьці і падрыхтоўцы да сэзону 1931 году (надрукавана ў «Зьвязьдзе ад 17—IV. Напомнім 1 абзац:

«У галіне падрыхтоўкі да выкананьня пляну торфаздабычы на 1931 год таксама маюцца буйнейшыя недахопы, якта: да гэтага часу плян на 1931 год не забясьпечан рабочай сілай, не падрыхтаваны мэханізмы, слаба выконваецца плян будаўніцтва, асабліва небясьпечна стаіць справа з вывазам торфу. Усе гэтыя недахопы ставяць пад пагрозу выкананьне пляну 1931 году. СЛАБАЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ 1931 ГОДУ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ВЫНІКАМ НЕВЫСТАРЧАЛЬНАЙ РАБОТЫ КІРАЎНІЦТВА ТАРФЯНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ПА РАЗГОРТВАНЬНІ САПРАЎДЫ БАЛЬШАВІЦКІХ ТЭМПАЎ РАБОТЫ»

Бюро ЦК вызначыла рад практычных мерапрыемстваў, якія павінны былі стаць для Белторфу і яго прадпрыемстваў і для іншых органаў (Наркамправы, Наркамснаб, Белкаапсаюз, раённыя арганізацыі) БАЯВОЙ ПРАГРАМАЙ ДЗЕЯНЬНЯ.

Чарапашыя тэмпы разгортваньня сэзону торфаздабычы сьведчаць аб тым, што ДЫРЭКТЫЎА БЮРО ЦК КП(б)Б НЯ ВЫКОНВАЕЦЦА, АБО ВЫКОНВАЕЦЦА ЗЛАЧЫННА МАРУДНА.

РАБОЧАЙ СІЛАЙ ТОРФАЗАВОДЫ ПОУНАСЬЦЮ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ. У гэтым вінаваты ня толькі самі прадпрыемствы і орган працы, але і многія раённыя арганізацыі, якія ставяць торфараспрацоўкі ў разрад апошніх, малаважных задач.

Пастанова ЦК камсамолу аб мабілізацыі 1.000 камсамольцаў на торфараспрацоўкі выканана толькі ЧАСТКОВА.

НАРКАМСНАБ І БЕЛКААПСАЮЗ ня ўжылі даволі рашучых мер да забясьпечаньня торфазаводу прадуктамі харчаваньня. Замест 30 сталовых на торфазаводах адкрыта ўсяго толькі 8. Буйнейшыя прадпрыемствы (Асінторф, «Шлях сацыялізму», імя 1 мая, «Чырвоны Кастрычнік») не забясьпечваюцца выстарчальнай кольвасцю прадуктаў і тавараў

Ад раду торфазаводаў ідуць трывожныя сыгналы АБ НАДЗВЫЧАЙ СЛАБАЙ ПАСТАНОЎЦЫ ПАЛІТЫКА-ВЫХАВАЎЧАЯ І КУЛЬТУРНА-МАСАВАЯ ПРАЦЫ СЯРОД РАБОЧЫХ, АБ ПОУНАЙ АДСУТНАСЬЦІ КІРАЎНІЦТВА САЦСПАБОРНІЦТВАМ І ЎДАРНІЦТВАМ. Пляны торфаздабычы да рабочых ящчэ НЕ ЗАВЕДЗЕНЫ. Белторф толькі гэтымі днямі разаслаў дырэктыву аб [illegible] ПЛЯНАЎ ТОР[illegible] ДЭКАДНЫХ І ШТОДЗЕННЫХ ЗАДАНЬНЯЎ няма нават у [illegible] ня робіцца для перадачы [illegible] на торфазаводы вопыту перадавых прадпрыемстваў Савецкага Саюзу па складаньні СУСТРЭЧНЫХ ПРАМФІНПЛЯНАЎ.

На ўсё добра на ВОБАЛЬСКІМ ТОРФАЗАВОДЗЕ ІМЯ ДАЎМАНА Мяркуючы паводле паведамленьня нашага карэспандэнта, КІРУЮЧАЯ ВЕРХАВІНА ЗАВОДУ ПОУНАСЬЦЮ РАЗЛАЖЫЛАСЯ: п'янства, дэбошы, грубы заціск самакрытыкі, ігнараваньне раённых парт-арганізацый — усе сымптомы: гнайніка. Тут патрэбна неадкладнае хірургічнае ўмяшальніцтва ЦКК-НК РСІ.

Задачы, ускладзеныя на нашу тарфяную прамысловасьць у 1931 г., надзвычай адказныя, каб недаацаніць усю сур'ёзнасьць абстаноўкі, у якой разгортваецца пачатак торфасэзону. Гаспадарчыя органы — ВСНГБ, Белторф і заводзкі раўніцтвы, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі, РАЕННЫ ДРУК — павінны неадкладна пераключыцца на выкананьне пляну торфаздабычы і поўнае ажыцьцяўленьне дырэктыў бюро ЦК КП(б)Б.

ВЯЛІЗАРНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ Ў РАБОЦЕ ТОРФАЗАВОДАЎ БУДЗЕ МЕЦЬ ТАВАРЫСКАЯ ДАПАМОГА З БОКУ РАБОЧАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ ЗАВОДАЎ — СПАЖЫЎЦОЎ ТОРФУ. Мы пічым, што такія прадпрыемствы, як «Дзьвіна», «Прафінтэрн», панчошная фабрыка ў Віцебску, «Вэзувій», «Чырвоны хэмік», «Новая гута» — у Гомелі, цэмэнтны і фасфэрытны заводы і камбінат у Крычаве, «Дняпро» і «Х Кастрычнік» у Рэчыцы, шоўкавая фабрыка ў Магілеве, фабрыка імя Дзяржынскага і завод «Чырвоны харчавік» у Бабруйску, «Чырвоная Бярэзіна і імя Домбаля ў Барысаве, «Гарой працы» ў Добрушы і «Спартак» у Шклове—прадпрыемствы, бесьперабойная работа і выкананьне прамфінпляну якіх ЗАЛЕЖЫЦЬ ЦАЛКАМ АД ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ АПАЛАМ — ТОРФАМ, могуць і ПАВІННЫ аказаць торфазаводам ПРАКТЫЧНУЮ ДАПАМОГУ Ў СПРАВЕ РАЗГОРТВАНЬНЯ СЭЗОНУ ТОРФАЗДАБЫЧЫ.

Мы высоўваем перад гэтымі прадпрыемствамі пытаньне аб ВЫТВОРЧЫМ ШЭФСТВЕ НАР ТОРФАЗАВОДАМІ, якое павінна выявіцца ў СЫСТЭМАТЫЧНАЙ ДАПАМОЗЕ Ў КІРАЎНІЦТВЕ САЦСПАБОРНІЦТВАМ І ЎДАРНІЦТВАМ, У ПЕРАДАЧЫ ЛЕПШАГА ВОПЫТУ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ФОРМ ПРАЦЫ, УЗМАЦНЕНЬНІ ПАЛІТЫКА-ВЫХАВАЎЧАЙ І КУЛЬТУРНА-МАСАВАЙ РАБОТЫ, НАРЭШЦЕ, У АКАЗАНЬНІ ДАПАМОГІ КВАЛІФІКАВАНАЙ РАБОЧАЙ СІЛАЙ ДЛЯ ПАСКАРЭНЬНЯ МАНТАЖУ І РАМОНТУ МАШЫН, ПАСКАРЭНЬНЯ КАПІТАЛЬАГА БУДАЎНІЦТВА, НАЛАДЖВАНЬНЯ САЦЫЯЛЬНА - БЫТАВЫХ УМОЎ РАБОТЫ ТОРФАЗАВОДАЎ.

Мы ня сумняваемся, што наша прапанова спаткае гарачы водгук грамадзкіх арганізацый вышэйпаказаных прадпрыемстваў. ХТО БУДЗЕ ПЕРШЫМ? Ажыцьцявім І ў гэтым мерапрыемстве пенінскія лёзунгі аб „сацспаборніцтве і ўдарніцтве.

«Вялізарныя рэсурсы торфу ў Савецкай Беларусі павінны стаць асноўнай базай для разгортваньня электрыфікацыі, забесьпячэньня апалам прамысловасьці, культурна-бытавых устаноў і для прамысловай пераапрацоўкі», «ЦК КП(б)Б ставіць перад тарфяной прамысловасьцю наступныя асноўныя задачы: забясьпечыць на працягу 3-х год такое разгортваньне здабычы торфу, якое забясьпечыла-б, як мінімум, перавод у гэты тэрмін усёй прамысловасьці, выпрацоўку электраэнэргіі і асноўных культурна-бытавых устаноў прамысловых цэнтраў на тарфяны апал».

Гэта пастанова ЦК КП(б)Б ПАВІННА БЫЦЬ ПОУНАСЬЦЮ І Ў ТЭРМІН ВЫКАНАНА.

Абнавіць кіраўніцтва Вобальскага торфзаводу

Вобальскі торфазавод і завод ізапліт—першы ў БССР і другі ў СССР. Праграма вытворчасьці з кожным годам пашыраецца. На Вульшчыне гэты завод зьяўляецца рабочым цэнтрам, пралетарскім асяродкам. Рабочыя арганізацыі на работу заводу зварачаюць шмат увагі. Ужо трэці ці чацьверты раз райком партыі на пасяджэньні бюро заслухоўвае даклад «трыкутніка».

У ружовых фарбах малюць становішча і намесьніка дырэктара Шчарбіна і сакратар парт'ячэйкі Абраменка. Яны хваляцца: балоты да сэзону падрыхтаваны. Плян выкананы на 108 проц. Праўда, лесу трэба было вывезьці 1.200 кбм., вывезена... 30 кмб., але на коньях заводу некалькі кубаматраў вывезлі дадаткова, а тэму на час бездарожжа будаўніцтва забясьпечана. Баракі будуць пабудаваны, толькі... матар'ялу для даху не хапае. Мэханічны цэх пад пагрозай, машыны не адрамантаваны, але.. адрамантуюць.

Па заводзе ізапліт таксама «ўсё добра»: праграма за 15 дзён красавіка выканана на 90 проц. З іх слоў выходзіла, што колькасьць прадукцыі павялічылася, якасьць паленшылася, кіраўніцтва ўзмацнілася, словам—«ўсё ў парадку».

Інакш падышоў да ацэнкі сваёй работы старшыня тарфкому — малады кандыдат партыі — выдвуэнец тав. Шацкін, падышоў з меркай самакрытыкі. «Рэарганізацыя прафсаюзнай працы, — заявіў ён,—ня скончана. Масы ў работу сэкцыі тарфкому не ўцягнуты. Распрацоўка прамфінпляну ня скончана. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва разгортваецца слаба, дагаворы не падпісаны».

Прадстаўнік камісіі, якая абсьледавала завод, дапоўніў:

— Прамфінплян зрываецца. Кіраўніцтва заводу займаецца «очковтирательством» Раней было заданьне падрыхтаваць балота для работы 14 машын, а потым толькі для 3 машын. Такім чынам заданьне выканана на 108 проц., выходзячы з 3 машын, а не 14.

Праграма на заводзе ізапліт выканана ў першым квартале 1931 г., толькі на 49,6 проц. Аб гэтым кіраўнікі заводу змаўчалі.

Затое вялікія посьпехі мае кіраўніцтва заводу на другім вучастку. Дырэктар Франкевіч сыстэматычна п'янствуе. Разам з ім пьянствуе намесьнік дырэктара Шчарбіна, загадчык гаспадаркі Міхайлаў і інш. П'янства ідзе адкрыта. Пасьля папоек наладжваюцца дабошы. У часе аднэй такой напойкі ў вёсны на заводзе здарылася аварыя, якая толькі выпадкова абыйшлася без чалавечых ахвяр. П'янства папыраецца, праскакае ў рабочыя масы, п'янству падаюцца менш устойлівыя радавыя партыйцы.

Маладняк паўстаў супроць такіх бясчынстваў. Камсамольская ячэйка выпускае насьценгазэту, выкрывае п'яніц. Праз два дні газэту хтосьці зрывае. П'яны дырэктар Франкевіч, з рэвальвэрам у руках гоніцца за Гарбуком—сакратаром ячэйкі ЛКСМБ. Той некалькі дзён не зьяўляецца ў кватэру, начуе ў інтэрнаце, баіцца паказвацца.

У «Зьвязьдзе» была зьмешчана заметка пад назвай — «Завод Даўмана ня рыхтуецца да сэзону». Заметку разьбіраюць на бюро ячэйкі КП(б)Б пры торфазаводзе. Выносяць пастанову: «фаткы, паказаныя ў заметцы, прызнаць цалкам няправільнымі. Даручыць тав. Франкевічу напісаць спраставаньне».

Пасьля гэтай заметкі Франкевіч аддае загад: «Гарбука ў канцылярыю ня пускаць, машынкі не даваць, нічога не паказваць». Калі Гарбук — камсамолец заходзіць да Франкевіча на кватэру, як да партыйца, параіцца, той крычыць: «Гарбук, свопач, выйдзі вон».

Адпойчы сакратар парт'ячэйкі Абраменка і дырэктар Франкевіч «праводзілі» сход на вёсцы, прысьвечаны кантрактацыі малака На сходзе прысутнічаў і старшыня райпрафсавету тав. Рэйнгольд. У спрэчках Абраменка заявіў, што пляны здачы малака не рэальныя. Тав. Рэйнгольд, жорстка крытыкуючы гэту кулацкую заяву, сказаў, што словы Абраменкі пахнуць правым апартунізмам. Тады Франкевіч выступіў з «аўтарытэтнай» заявай: — «Ніць нас страпыць, у вас то правыя, то «левыя» апартуністы. Пляны не рэальныя».

Франкевіч ігнаруе райком КП(б)Б, ня хоча зьяўляцца на пасяджэньні бюро. «Калі вам трэба, прыяжджайце да мяне» — так адказвае Франкевіч на запрашэньне. Так разважае і сакратар ячэйкі Абраменка.

Усе гэтыя факты патрабуюць, каб кіраўніцтва торфазаводу было неадкладна абноўлена. Такія кіраўнікі, як Франкевіч і Абраменка, не забясьпечаць выкананьня прамфінпляну.

А. МІКУЦКІ.

Толькі пачалі рухацца

Торфазавод «Міхеновічы» да апошняга часу знаходзіўся ў веданьці інстытуту прамысловасьці. Загадчык Маркоўскі і тэхнарук Вішнеўскі ніякай падрыхтоўкі балота да сэзону не праводзілі. Машыны не адрамантаваны, торф пакінут на балоце. Усё абсталяваньне — дошкі, тросы, элеватарны ланцуг — усё засталося над сьнягам, папсавалася. Усе чакалі перадачы балота ў Белторф і нічога не рабілі

4-га красавіка прыехаў дырэктар Гуцэў ад Белторфу. За кароткі час, які застаўся да пачатку сэзону, трэба было і рабочых навербаваць, і тэхнічны штат падабраць, і служачых знайсьці. Вызьдзіў дырэктар тав. Гуцэў у Белторф за дапамогай, але дапамогі ніякай не атрымаў. На заводзе адчуваецца недахват спэцвопраткі — няма ланцей, бахіл атрымана толькі 100 пар. Няма катлоў для сталоўкі, дошак для інтэрнату, абсталяваньня для пякарні. Шмат паперак напісалі, а толку мала.

Забясьпечаньне заводу прадуктамі ўключыні ў плян толькі 1-га мая. Белкаапсаюз даў разнарадку Сьмілавіцкаму райкаапсаюзу толькі 3-га мая. Ні райкаапсаюз, ні Міхаінавіцкае сельпо не капацяцца аб забясьпечаньні торфазаводу прадуктамі.

Трэба пачаць працуючае і даць магчымасьць торфазаводу выканаць свой прамфінплян.

Х.

Як быў сарваны сэзон на торфзаводзе „Чырвоны сьцяг“

«Зьвязда» пісала ўжо аб прарыве ў падрыхтоўцы да сэзону торфаздабычы на торфзаводзе «Чырвоны сьцяг». Па-на торфзаводзе ня жадала выконваць куль што значнага пералому на заводзе няма. Наводле пляну завод павінен мець да сэзону 1.400 рабочых. Ёсьць толькі 800. Замест 5 машын ёсьць 2.

Рабочая брыгада, якая абсьледавала завод, знайшла, што значная частка вінны падае на Белторф.

Яшчэ ў лютым Белторф абяцаў заводу падрыхтаваць патрэбную колькасьць рабочых - параўшчыкоў, а ў сакавіку прыслаў заводу паперку аб тым, што параўшчыкоў ня дасьць, што іх трэба рыхтаваць на месцы і што да 1-га красавіка прышле інструктара для арганізацыі курсаў. Завод падабраў кадр курсантаў, але дапамогі ніякай не атрымаў. На заводзе адчуваецца недахват спэцвопраткі — няма ланцей, бахіл атрымана толькі 100 пар. Няма катлоў для сталоўкі, дошак для інтэрнату, абсталяваньня для пякарні. Шмат паперак напісалі, а толку мала.

Забясьпечаньне заводу прадуктамі ўключыні ў плян толькі 1-га мая. Белкаапсаюз даў разнарадку Сьмілавіцкаму райкаапсаюзу толькі 3-га мая. Ні райкаапсаюз, ні Міхаінавіцкае сельпо не капацяцца аб забясьпечаньні торфазаводу прадуктамі.

Трэба пачаць працуючае і даць магчымасьць торфазаводу выканаць свой прамфінплян.

Х.

Трэба сказаць, што адміністрацыя Барысаўскага заводу «Чырвоны Кастрычнік» упарта не жадала выконваць дырэктывы Белторфу і перадаць машыны заводу «Чырвоны сьцяг». Тры разы людзі прыяжджалі па машыны, тры разы яны вярталіся назад, бо дырэктар «Чырвонага Кастрычніка» нават не [illegible]цеў з імі гаварыць. Ня гледзячы на гэта, Белторф абмежаваўся толькі тым, што дырэктару «Чырвонага Кастрычніка» паставіў на від. Толькі пасьля ўмяшаньня СНК машыны былі атрыманы хоць і са значным спазьненьнем.

Такой-жа палітыкі прытрымліваўся і старшыня Барысаўскага РВК Шапіра, які не падпарадкаваўся тэлеграме тав. Бэнэка аб выдачы машын. І адзін эскамабіль, належачы Белторфу, не атрымае да гэтага часу.

Нарэшце, машыны былі атрыманы. Але ў якім выглядзе? Завод «Чырвоны Кастрычнік» аддаў тыя машыны, на якіх працаваць нельга. Апрача таго і з гэтых пасаваных машынах годныя часткі былі заменены нягодными, пасаванымі. У выніку за дастаўку 2-х машын з Барысава па сапсаванай дарозе крышлося пераплаціць 3.000 руб.

Іншыя тры машыны, якія завод «Чырвоны сьцяг» павінен быў атрымаць у Чашніках, Гомелі і Чарэі, здаставіць на месца немагчыма з прычыны позьняга іх атрыманьня ў самае бездарожжа.

Такім чынам падрыхтоўка да сэзону сарвана Замест 5 машын, торфазавод будзе працаваць толькі на 2-х.

Гэтай справай ужо зацікавіліся некаторыя арганізацыі і трэба спадзявацца, што вінаватыя атрымаюць па заслугах. Але адпаведным органам трэба паклапаціцца ў гэтай справе глыбей, бо тут ёсьць элементы яўнага шкодніцтва.

МІХ. КРАСОЎСКІ.

Капаньне торфу

Партыйнае будаўніцтва

Агонь па душыцелях самакрытыкі і іх абаронцах

Па-бальшавіцку кіраваць насьценгазэтамі, павышаць іх ролю ў сацыялістычным будаўніцтве, у разгортваньні пралетарскай самакрытыкі

ПЕРАСЯКАЦЬ У КОРАНІ

Сёньня мы зьмяшчаем рад фактаў з месц аб грубым заціску самакрытыкі. Гэтыя факты выразна гавораць аб тым, што асобныя нізавыя партэьвеньні яшчэ ня сталі на чале разгортваньня жорсткай бальшавіцкай самакрытыкі, не карыстаюцца ёю, як самай вострай зброяй у змаганьні за выкананьне і перавыкананьне праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі. І горш за ўсё тое, што ў ролі душыцеляў самакрытыкі мы бачым ня толькі сацыяльна-варожых элементаў, ня толькі асобных радавых работнікаў, а падчас кіруючых таварышоў, членаў партыі.

Карэспандэнцыя з ЛЮСТЭРКАВАЙ ФАБРЫКІ выкрывае недапушчальныя зьявішчы з душэньнем самакрытыкі, якое выходзіць з боку сакратара ячэйкі КП(б)Б РОЗАВА і старшыні камітэту ўзаемадапамогі БЭРМАНА. Ганебны факт! Кіруючыя работнікі замест таго, каб стварыць спрыяючыя абставіны для разгортваньня жорсткай пралетарскай самакрытыкі, замест таго, каб правучыць трапіўшых на фабрыку былых эксплёататараў, якія душаць самакрытыку, становяцца самі ў ролі заціску крытыкі.

Насьценгазэты на нашых прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах зьяўляюцца магутнай зброяй у руках партыйных арганізацый у змаганьні за выразнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. Гэту ісьціну зразумелі яшчэ ня ўсе партыйцы. У нізавых партыйных зьвеньнях знаходзяцца такія асобы, якія, апартуністычна недаацэньваючы значэньне нізавога друку, яго ролю ў сацыялістычным будаўніцтве, не садзейнічаюць, а падчас нават тармозяць разгортваньне самакрытыкі праз насьценгазэты. На фабрыцы «Спартак» (Сьвіслацкі раён) былі выпадкі, калі асобныя камуністы нездарова рэагавалі на крытыку праз насьценгазэту, ня спрялі шырэйшаму згуртаваньню вакол яе рабоўкаў.

Апартуністы, агенты клясавага ворага—кулацтва, элементы, якія разлажыліся,—з нянавісьцю адносяцца да насьценгазэт, якія выкрываюць усе перашкоды, што стаяць на шляху сацыялістычнага будаўніцтва. У карэспандэнцыі з Вульскага раёну пра ВОБАЛЬСКІ ТОРФЗАВОД паведамляецца аб ганебных фактах заціску самакрытыкі з боку дырэктара заводу ФРАНКЕВІЧА, аб прасьледваньні ім членаў рэдакцыйнай калегіі. Дайшло нават да таго, што п'яны Франкевіч з рэвальвэрам у руках ганяўся за сакратарэм камсамольскай ячэйкі, які зьяўляўся адным з ініцыятараў і кіраўнікоў насьценгазэты.

Партыйныя арганізацыі павінны яшчэ з большай рашучасьцю біць па канкрэтных носьбітах заціску самакрытыкі, па ўсіх тых, хто ня здолен стаяць на чале мабілізацыі мас на ажыцьцяўленьне важнейшага лёзунгу партыі, хто патурае заціску пралетарскай крытыкі і самакрытыкі. Нізавыя партэьвеньні павінны ў корані перасякаць усякую спробу заціскаць самакрытыку, ад каго-б гэта спроба ня выходзіла.

ДА АДКАЗНАСЬЦІ ГЛУШЫЦЕЛЯЙ!

На люстэркавай фабрыцы камітэту ўзаемадапамогі (Менск) пануюць ганебныя непарадкі. Вядомы эксплёататар і былы ўласьнік майстэрань, Тышлер, які ў 1929 і 1930 г. плаціў тысячу з лішнім рублёў падатку, ва ўсю арудуе на фабрыцы. Ён зьдзекуецца з рабочых. Па яго віне фабрыка мела страты. Ён, будучы майстрам, браў прыватныя заказы, выконваў іх у рабочы час і грошы клаў сабе ў кішэню, вазіў з фабрыкі на кватэру апал.

Гэты былы эксплёататар ігнаруе рабочых, не падтрымлівае тых мерапрыемстваў, якія зьяўляюцца результатам ініцыятывы рабочых мас. Калі рабочыя ў адзін з сваіх выхадных дзён арганізавалі суботнік, Тышлер дэманстрацыйна на яго ня выйшаў. Рабкоры аб гэтым напісалі ў насьценную газэту. Тышлер абурыўся крытыкай і таму рабочаму, які быў аўтарам допісу, назаўтра ня даў работы, заявіўшы: «для тых, хто піша аба мне ў газэту і скардзіцца на мяне старшыні мясцкому, хто расказвае, аб тым, што робіцца ў маім цэху, я работы ня дам». Гэты агідненьны факт заціску самакрытыкі з боку былога эксплёататара Тышлера быў прадметам абмеркаваньня Менскага гарадзкога камітэту саюзу хэмікаў. Факты пацьвердзіліся!

Глушэньне самакрытыкі на люстэркавай фабрыцы выходзіць ня толькі ад былых эксплёататараў, а нават з боку некаторых членаў партыі. Сакратар партыйнай ячэйкі, Розаў, аказаўся самым заядлым душыцелям самакрытыкі. Пачалося з таго, што ў насьценгазэту люстэркавай фабрыкі паступіў допіс аб бязьдзейнасьці Розава, як культработніка. Гэта бязьдзейнасьць выявілася ў тым, што гурткі Асоавіяхіму, гурткі па ліквідацыі пісьменнасьці, якія існавалі на прадпрыемствах камітэту, не працавалі і нарэшце разваліліся. Культработнік Розаў ня ўжываў ніякіх мер — для папярэджаньня гэтага недапушчальнага зьявішча. Ён наадварот падумаў аб арганізацыі палітгурткА ў той час, як вялікая частка рабочых прышлі на прадпрыемства пядаўна і зьяўляюцца палітычна пісьменнымі.

Аб усіх гэтых фактах паступіў допіс у насьценгазэту. Калі рэдкалегія друкавала матар'ял, да яе падышоў сакратар ячэйкі Розаў і пераглядзеў матар'ял. Убачыўшы допіс пра сваю бязьдзейнасьць, Розаў абурыўся і прапанаваў рэдкалегіі даць увесь матар'ял яму для прагляду, заявіўшы, што, магчыма, ён частка матар'ялу ў газэту не прапусьціць. Калі сакратар рэдкалегіі адказаў яму, што па гэта ён, Розаў, ня мае ніякага права, апошні заявіў, што сарве, ня дасьць выпусьціць насьценгазэту.

Назаўтра-ж Розаў паставіў пытаньне аб перавыбарах рэдкалегіі. Сабраўшы сход рабочых, ён выступіў і пачаў даводзіць, што рэдкалегія зьяўляецца контррэвалюцыйнай (?), бо выступіла супроць партыі. Душыцель самакрытыкі, Розаў, лічыць, што крытыка яго асобы ёсьць выступленьне супроць партыі! Якое нікчэмнае, бязглуздае і недапушчальнае разважаньне!

Характэрна, што прысутны на гэтым сходзе старшыня камітэту ўзаемадапамогі, Бэрман, выступіў у ролі самага заядлага абаронцы душыцеля самакрытыкі Розава. Стаўшы ў вызыўнічую позу, Бэрман заяўляе: «Зьмяцем з твару зямлі тых рабочых, якія нам будуць паказваць на недахопы і перашкаджаць у рабоце».

Душыцелі самакрытыкі, Розаў і Бэрман, павінны быць прыцягнуты да самай суровай адказнасьці. Спадзяемся, што гарадзкая КК-РСІ ўжыве рашучыя меры па ездараўленьні прадпрыемствакамітэту ўзаемадапамогі, на ачышчэньні іх ад душыцеляй самакрытыкі і былых эксплёататараў.

ЗОРКІ.

НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ

Праверка стану разгортваньня самакрытыкі ўнутры партыйнай і рабочай дэмакратыі па Сьвіслацкім раёне паказала, што раённыя партарганізацыі ў сваёй мінулай дзейнасьці не забясьпечылі поўнага ажыцьцяўленьня лёзунгу партыі аб самакрытыцы, «ня гледзячы на асобы».

Праверка выявіла рад момантаў, калі ў нізавых партыйных зьвеньнях асобныя камуністы ня толькі не стаялі на чале разгортваньня самакрытыкі, а, наадварот, тармазілі яе разгортваньне, заціскалі яе. На заводзе «Спартак» мелі месца факты, калі крытыку асобных недахопаў у рабоце мясцовай арганізацыі кваліфікавалі, як паскок на генэральную лінію партыі. На заводзе «Кастрычнік» асобныя камуністы хваравіта рэагуюць на крытыку праз насьценную газэту. Там-жа бухгальтар заводу крытыку, якая выходзіць ад насьценгазэты, абзывае плёткамі і «падсеждваньнем».

У раёне ёсьць шмат недахопаў у справе стварэньня спрыяючых умоў для разгортваньня самакрытыкі. Перш за ўсё трэба паказаць на тый факт, што рад устаноў недапушчальна дрэнна рэагуюць на допісы, якія прысылаюцца рэдакцыямі для расьсьледваньня. Па-другое, тое, што рад работнікаў, якія скампрамэтавай сябе на рабоце, ня толькі ня зьнімаюцца з пасад, а назначаюцца на больш адказную работу. Так, дырэктар заводу «Кастрычнік», Пісараў, быў зьняты з работы за праваапартуністычную практыку, зараз выступае на больш адказную пасаду ў Шклаабʼяднаньне (Менск). Пасьля ліквідацыі акругі у раён быў прыслан адзін былы адказны работнік, які канчаткова падарваў свой аўтарытэт. Ён, чамусьці, апынуўся на адказнай рабоце ў райкаапсаюзе.

У раёне пры мінулым кіраўніцтве мелі месца факты прасьледваньня рабселькораў, якія выкрывалі ўсялякія недахопы ў рабоце раённых арганізацый. Адзін з гэтых рабселькораў былым старшынёю райвыканкому быў зведзен з работы, другі-ж быў пазбаўлены выбарчых правоў. Райпартарганізацыя вакол гэтых недапушчальных фактаў, грубага заціску самакрытыкі мабілізавала ўвагу самых шырокіх калгасных і бядняцка-сераднякіх мас.

Работа з рабселькорамі ў раёне пастаўлена яўна новыстарчальна. За год былі праведзены тры нарады, але на іх прымала ўдзел вельмі мала рабселькораў (10-13 асоб), у той час, як у раёне значна больш таварышоў, якія прымаюць удзел у друку. Зараз, асабліва ў перыяд падрыхтоўкі да ўсебеларускага зьезду рабселькораў, райпартарганізацыя павінна разгарнуць шырокую работу па мабілізацыі мас на ажыцьцяўленьне пастаноў цэнтральных партораганаў.

Праверка стану самакрытыкі па раёне праводзілася пры шырокім удзеле парткалгасных і бядняцка-сераднякіх мас. Раённая КК-РСІ ўжыла рад канкрэтных мер, накіраваных на тое, каб разгортваньне самакрытыкі ўзьняць на яшчэ вышэйшую ступень.

Пад знакам разгортваньня самакрытыкі

Па ўсёй Клімавіцкай райпартарганізацыі скончыліся перавыбары бюро ячэек. Перавыбары праходзілі пад знакам шырокага разгортваньня самакрытыкі, пад лёзунгам ператварэньня саўгасаў і калгасаў у апорныя пункты партработы на вёсцы.

Перавыбары паказалі, што абсалютная большасьць парт'ячэек раёну шчыльна падыйшлі да пытаньняў калектывізацыі і на яе аснове ліквідацыі кулацтва як клясы. Аб гэтым гавораць наступныя лічбовыя паказальнікі. У раёне дзейнасьці Пуцімльскай ячэйкі 92 % бядняцка-сераднякіх гаспадарак ахоплены калектывізацыяй, у раёне дзейнасьці Малашкавіцкай ячэйкі—88,5%, Гусарскай—85 проц., Судзілаўскай—74 проц., Раднянскай—72 проц. і Галіцкай —66 проц. Аднак, гэтыя ячэйкі невыстарчальна замацавалі паварот да штодзённага канкрэтнага кіраўніцтва асобнымі галінамі саўгаснай і калгаснай вытворчасьці (арганізацыя працы, увядзеньне вядзельшчыны, масавая работа сярод калгаснікаў і інш.).

Побач з вышэйпамянёнымі ячэйкамі ёсьць у раёне і такія, што апынуліся ў палоне апартуністычнай стаўкі па самацёк. Сярод іх Красавіцкая ячэйка, у раёне дзейнасьці якой толькі 12% бядняцка-сераднякіх гаспадарак ахоплена калгасамі, Хатовіцкая—25 проц, Ціманаўская—27 проц. Такія-ж ячэйкі, як Дубравіцкая і Студзянецкая, на працягу апошняга паўгоду зусім ня маюць прыліву ў калгасы.

Перавыбарчыя сходы ў большасьці парт'ячэек прайшлі пры актыўным удзеле ў абгаварэньні справаздач бюро беспартыйнага калгаснага актыву. Карыстаючыся мэтадам бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі, партыйныя масы і калгасны актыў выкрывалі недахопы ў рабоце ячэек і асобных камуністаў. У Ціманаўскай, Скліменскай, Дубравіцкай і Дамамзрыцкай ячэйках дакладчыкі, робячы справаздачы бюро, змазалі асноўныя гаспадарча-палітычныя пытаньні. Перавыбарчыя сходы прызналі работу бюро гэтых ячэек нездавальняючымі. Сакратар Малашкавіцкай ячэйкі Навалёў у сваёй справаздачы сьвядома моўчкі абышоў пытаньне націску на кулака, спагнаньне з кулацтва цьвёрдых заданьняў.

Перавыбары бюро ячэек цесна ўвязваліся з работай па перабудове партыйнай работы ў адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Зараз рад сельсавецкіх ячэек рэарганізаваны ў калгасныя. Выявілася неабходнасьць у арганізацыі парткомаў у радзе пунктаў раёну.

Перавыбарчая кампанія яшчэ больш павысіла баяздольнасьць Клімавіцкай арганізацыі на фронце змаганьня за новыя калгасы, на фронце разгортваньня бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі.

В. Бальзоўскі.

ДЭЗЭРТЫР

ЦК КП(б)Б прыняў спэцыяльную пастанову аб умацаваньні апарату рэдакцый раённых і цэнтральных газэт.

Друк—адзін з важнейшых вучасткаў партыйнай работы. І вось, у парадку выкананьня гэтай пастановы, з нядаўняга выпуску факультэту савецкага будаўніцтва на работу ў газэты было накіравана некалькі выпуск

МТС—У БОЙ ЗА ВЫСОКУЮ ТАВАРНАСЬЦЬ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Крута падняць выпрацоўку трактара, ліквідаваць злачынныя адносіны да машын, завесьці сталы вучот работы, выправіўшы скажэньні зьдзельшчыны

Адсутнасьць працдысцыпліны, прастоі, паломкі трактараў і разбазарваньне гаручага—асноўныя тормазы ў рабоце Койданаўскай і Гарадоцкай МТС

Баявое праведзеньне масавай сяўбы, гаспадарчая ўзьнемаганнямога паміж калгасамі і аднаасобнікамі, удар па кулаку—лепшы сродак уцягненьня ў калгасы новых мас беднякоў і сераднякоў

МТС павінны быць на перадавой лініі пасеўнай

Зацяжная зіма і ў сувязі з гэтым позні пачатак палявых работ патрабуюць максымальна ўшчыльненых тэрмінаў сяўбы. МТС павінны быць у авангардзе, павінны паказаць прыклад хутчэйшага скончэньня веснавой сяўбы.

На 10-га мая па БССР распачалі сяўбу 19 МТС, якімі засеяна 3.913 гэкт. з агульнага пляну ў 227.000 гэкт.

Першыя дні практычнай работы МТС паказалі, што ў рабоце МТС ёсьць рад сур'ёзных прарываў і недахопаў, якія тэрмінова павінны быць выпраўлены.

Бераж.лівыя адносіны да трактара яшчэ ня сталі лёзунгам кожнага рабочага МТС.

З раду раёнаў паступаюць весткі аб няўважлівых і злачынных адносінах трактарыстаў да машын, у выніку чаго мы маем факты частых паломак трактараў. У Дубровенскім, Мсьціслаўскім, Гарадоцкім і Койданаўскім раёнах новыя машыны праз 1-2 дні работы ў полі выходзяць са строю з-за паломак.

Нормы выпрацоўкі большасьцю МТС ня выконваюцца. У той час, як у Танежыцкай МТС трактар з двухкорпусным плугам заворвае за 20 гадзін 7 гэкт., у Гарадоцкай МТС за 7 гадз. трактар заворвае толькі 0,7 гэкт.

Эканомія гаручага таксама не праводзіцца. Трактарысты ня прытрымліваюцца вызначаных норм выдаткаваньня гаручага, не навучыліся яго эканоміць. У радзе МТС трактары забясьпечаны гаручым толькі на 1-2 тыдні.

Арганізацыйна-масавая работа ў раёнах дзейнасьці МТС таксама яшчэ не стаіць на належнай вышыні. На 10 мая ў раёнах МТС на зьдзельшчыну праведзена толькі 71,8 проц. усіх калгасаў.

Усе гэтыя недахопы патрабуюць тэрміновага выпраўленьня. З 10 па 20 мая па БССР праводзіцца 10-дневнік агляду гатоўнасьці МТС да сяўбы. Гэта 10-дневка павінна быць скарыстана для поўнай ліквідацыі ўсіх недахопаў, якія зараз неглядаюцца пры пачатку сяўбы.

МТС уступілі ў рашаючыя баі за бальшавіцкую сяўбу. У бліжэйшыя дні МТС павінны дабіцца рашучага пералому ў тэмпах сяўбы з тым, каб у самы найкарацейшы тэрмін поўнасьцю выканаць і перавыканаць пляны сяўбы.

ЗАМЕСТ 21 ГАДЗІНЫ—10-12 ГАДЗІН У СУТКІ

працуюць трактары Койданаўскай МТС

Анархічная стаўка на самацёк, яўная недаацэнка з боку райкалгасаюзу і МТС задач пасеўнай кампаніі—асноўная прычына зрыву сапраўднага ўкараненьня зьдзельшчыны, ліквідацыі абязлічы на калгасах Койданаўскага раёну. Наводле пестак райкалгасаюзу пераведзена на зьдзельшчыну 70 калгасаў з існуючых па раёне 91 калгасаў. Па 21 калгасе пытаньне аб зьдзельшчыне не абмяркоўвалася таму, што аграномы Койданаўскай сямігодкі і саўгасу Негарэлае ня выканалі свайго заданьня, якім было даручана правесьці гэту работу.

Фармальны перавод на зьдзельшчыну ня даў адпаведных вынікаў. У большасьці калгасаў раёну нормы выпрацоўкі не праведзены да брыгад і паасобных калгаснікаў. Зьдзельныя нормы не ацэнены у працадніх. Калгаснікі ня ведаюць, якія работы адносяцца да лёгкіх, сярэдніх, цяжкіх і кваліфікаваных і як яны ацэньваюцца. Старшыні брыгадзіры ня маюць магчымасьці весьці дакладны ўлік працы (Калгасы «Новае жыцьцё», «Мархлеўскі», «Ленінскі шлях» і інш.).

У радзе калгасаў рабочая сіла не разьбіта на брыгады, ліквідацыя абязлічы не праведзена. У выніку сяўба праходзіць абыяк, ёсьць выпадкі вала калгаснікі ня выходзяць на работу («Новая праца», «Х зьезд саветаў»). У калгасе «Бальшавіцкая сяўба» яшчэ ня складзен вытворчы і работы плян, насеяны фонд ня створаны, калгаснікі ня ведаюць, якія культуры і дзе сеяць.

Зусім **адсутнічае ўлік** працы на калгасах, ад чаго залежыць поўнае і якаснае выкананьне норм выпрацоўкі і правільнае разьмеркаваньне прыбытку. Гэта вельмі важная справа недаацэньваецца з боку Калгасасаюзу.

Горшая справа з работай МТС. Трактары маршылі ў поле са спазьненьнем на 5 дзён з прычыны несвачасовай дастаўкі газы. Частае псаваньне трактараў выклікае прастой на 8-10 гадзін у суткі. **Замест 21-х гадзін працы ў суткі трактары працуюць па 10-12 гадзін.** Нормы корыва ня выконваюцца. У калгасе «Новае жыцьцё» 4 трактары за 3 сутак зааралі 52 гэктары замест 108 гэкт.

Як на калгасах, таксама і па МТС адсутнічае ўлік выкананай працы. Анархічнымі разважаньнямі, у прыватнасьці дырэктара МТС Міхайлоўскага, што прычынамі частых прастояў трактараў і невыкананьня норм выпрацоўкі зьяўляюцца кепскія ўмовы глебы, ня дае адпору.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута як унутры калгасаў паміж брыгадамі і калгаснікамі, так і паміж калгасамі. У большасьці калгасаў на сходах прыняты выклікі, заключаны дагаворы, але яны засталіся толькі на паперы. Праверка выкананьня дагавораў не наладжана. Канкрэтныя прапановы ня высунуты. Ніхто гэтай справай ня кіруе, партыйныя і камсамольскія ячэйкі стаяць у баку. Аналягічнае станоўішча па МТС. На адным са сходаў трактарыстаў і мэханікаў была вынесена пастанова разгарнуць сацспаборніцтва паміж брыгадамі па вучастках і паміж паасобнымі трактарыстамі, якая ня выканана.

Пры МТС ёсьць парт'ячэйка і камсамольскі калектыў, у якіх налічваецца каля 80 проц. усіх рабочых, з боку некаторых камсамольцаў і партыйцаў ёсьць факты нядбайных адносін да гаручага, былі выпадкі, калі начная зьмена пакінула трактары на полі, а трактарысты пашлі спаць (калгас «Новае жыцьцё»).

Насьцепныя газэты калгасаў і сельсаветаў не мабілізаваны вакол задач змаганьня за выкананьне праграм другой бальшавіцкай вясны. Раённая газэта «Ударнік Койданаўшчыны» таксама не вытварчальна змагаецца за пасьпяховы ход сяўбы, не выкрывае канкрэтных зрыўшчыкаў зьдзельшчыны, не перадае дадатнага вопыту з калгасу ў калгас у той час, як у раёне ёсьць рад дадатных прыкладаў з неравыпрацоўкай норм у калгасе «Варашылаў» пад уплывам кулацкай агітацыі адмовіліся ад зьдзельшчыны, заяўляючы, што «зьдзельшчына ярмо для калгаснікаў, як, моў, захочам, так і будзем працаваць». Газэта ня ўдарыла на гэтых кулацкіх настроях.

Усе вышэйпаданыя факты сьведчаць аб тым, што раённыя партарганізацыі, асабліва Калгасасаюз і МТС, не пераключыліся на ўдарныя тэмпы работы. Раённае кіраўніцтва павінна ўжыць неадкладныя захады для таго, каб праграма веснавой сяўбы была выканана поўнасьцю. У першую чаргу павінна быць забясьпечана ўвядзеньне зьдзельшчыны і настаўлены на службу веснавой сяўбе ўсе грамадзкія арганізацыі, усе мэтады работы.

Брыгадзір «Зьвязды» Іс. К—н.

Гарадоцкая МТС—у тыле пасеўнай

Рулявыя не падрыхтаваны. Масавыя паломкі трактараў—звычайная зьява

ГАРАДОК.

Поўнае ігнараваньне дырэктыў вышэйшых органаў і асабліва пастановы VI зьезду саветаў прывяло Гарадоцкую МТС да раду прарываў. Раённыя арганізацыі не зьвярнулі належнай увагі на работу і падрыхтоўку МТС да сяўбы, не скарысталі яе, як магутны сродак арганізацыі новага прыліву бяднякоў-сераднякоў гаспадарак у калгасы.

Ад гэтым выразна гаворыць факты. У радыусе дзейнасьці МТС процант калектывізацыі складае толькі 15, а па падліках Трактарацэнтру — 9. Падрыхтоўка кадраў рулявых фактычна сарвана. Пастанова раённай кантрольнай камісіі аб падрыхтоўцы рулявых раённымі арганізацыямі ігнаравалася.

МТС у поле выйшла непадрыхтаванай, рулявыя селі на трактар мала падрыхтаванымі. У першы дзень працы ў вёсцы Кузьміна 5 мая адзін трактар выйшаў са строю, у калгасе «Чырвоны пуцілавец» не працуе адзін трактар, у якім паламалі сацыяты, канічныя шаксьпіны, кажухі, зьвярнулі паўвось і паламалі задні мост.

Былі выпадкі паломкі трактараў таксама ў калгасах імя Крупскай, імя Чарвякова, «Зара». Затрыманьні работы трактараў мелі месца і па трактарных палёнах Мікалаеўскага, Даўжанскага і Палімінскага сельсаветаў. Між тым кіраўніцтва МТС не вазілася вывучаньнем прычын гэтых галоўных зьяўлеч.

Найважлівыя адносіны трактарыстаў да трактараў адразу адбіліся на прадукцыйнасьці працы ў полі. Нормы выпрацоўкі ня выконваюцца. Так, у калгасе «Валдарскага» за 15 гадзін узарана толькі 1,8 гэктара, у калгасе імя Крупскай за 7 гадз. — 0,7 гэкт., у калгасе імя Сталіна за 9 гадзін узараны 1 гэктар.

Выдаткаваньне гаручага перавышае ўсякія нормы. У калгасе «Валдарскага» на ворыва 1,8 гэктара выдаткавана 60 кілёграм гаручага, у калгасе імя Крупскай на 0,7 гэкт. — 78 кілёграм, імя Сталіна па 1 гэкт. — 47 кілёграм.

Да гэтага часу МТС ня мае поўнай нагрузкі: Зямельная плошча, намечаная НКЗБ, дасягае 6.400 гэкт., а дагавораў заключана толькі на 4.518 гэктараў. А з трыма калгасамі дагаворы ня заключаны.

Сярод вакольнага насельніцтва ніякай масавай работы не вядзецца. Інструктар па масавай рабоце Самусевіч быў пасланы райкомам на пасеўную кампанію не ў раён дзейнасьці МТС. Сацыялістычнае спаборніцтва ня стала асноўным мэтадам работы МТС. Ня ўжываецца пітадам мер да разгортваньня ўдарніцкага руху сярод рабочых МТС.

З боку паасобных кіраўнікоў станцыі наглядаюцца недапушчальныя адносіны да работы. Намесьнік дырэктара тав. Шумскі два разы самавольна адлучаўся адзін раз на 5 дзён, другі раз на 7 дзён, п'янствуе і наогул нядбайна адносіцца да работы.

Усе гэтыя факты прымушаюць біць трывогу. Трэба ўжыць тэрміновыя меры. Партыйна-камсамольскім і савецкім арганізацыям раёну неабходна паставіць у цэнтр увагі работу МТС. Разгарнуць шырокую масава-палітычную работу і ўзьняць палітычна-арганізуючую ролю МТС на належную вышыню. Шырэй разгарнуць самадзейнасьць і спаборніцтва рабочых і калгасных мас на выкананьне задач, якія стаяць перад МТС.

Ш.

Выбарка насеннай бульбы для сяўбы

Неадкладна даць машыны і запасныя часткі Дубровенскай МТС

Бюракраты з Белсельгасснабу зрываюць сяўбу ў Дуброўне

ДУБРОЎНА. Дубровенская МТС распачала сяўбу яшчэ 2 мая. Але бюракратычныя адносіны з боку раённых і цэнтральных устаноў да забесьпячэньня станцыі патрэбным інвэнтаром зрываюць разгортваньне пасеўных работ.

Раней на МТС было 40 трактараў і 39 прычэпных плугоў. Некаторы час назад Трактарацэнтр распарадзіўся адгрузіць 13 плугоў і 10 трактараў. Такім чынам, на станцыі засталося толькі 30 трактараў і 26 плугоў. У выніку 4 трактары стаяць без усякага скарыстаньня з-за адсутнасьці прычэпнага інвэнтару.

Белсельгасснаб яшчэ 2 месяцы таму назад накіраваў у МТС 20 12-радковых сявярак, але чамусьці бёз пярэдніх часьцей. Сявяркі стаяць. 2 месяцы, як МТС піша аб тым, што зрываецца пасеўная кампанія і аб неабходнасьці замяніць сявяркі, але ніякага адказу няма.

МТС ужо скончыла ворыва, але з прычыны такіх адносін ня можа прыступіць да сяўбы.

Адчуваецца таксама недахват і дыскавых боран, якія Белсельгасснабам абяцаны, але не прысылаюцца. У той-жа час у Воршы на складах райкаапсаюзу ляжаць 15 дыскавых боран. Ня гледзячы на просьбы МТС адпусьціць гэтыя бораны, райкаапсаюз іх не адпускае.

Гаручым МТС забясьпечана толькі на 2 тыдні.

Забясьпечыць Касьцюковіцкую МТС аўтолам

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. (Па тэлеграфу).

Па віне Наркамзему і Нафтасьндынату Касьцюковіцкая МТС зусім ня мае аўтолу. Адсутнасьць аўтолу зрывае працу трактараў і ход веснавой сяўбы. Неабходна ўжыць рашучыя меры і забясьпечыць МТС аўтолам.

ГРЫШАНАЎ.

Зводка

аб ходзе сяўбы ў МТС на 10 мая 1931 г.

Назва МТС.	Калі распачата сяўба.	Колькі засеяна (у гэктарах).	Проц. выкананьня пляну.
Ветрынская	5-V	33	0,4
Горацкая	5-V	85	1
Лепельская	9-V	76	0,9
Шклоўская	7-V	30	0,3
Вушацкая	8-V	70	0,7
Койданаўская	5-V	831	5,2
Дубровенская	9-V	35	0,5
Заслаўская	5-V	138	1,5
Капыльская	5-V	257	4,1
Танежыцкая	4-V	205	2,5
Смалявіцкая	3-V	326	3,5
Слуцкая	4-V	612	8,5
Клімавіцкая	6-V	230	1,9
Церахаўская	5-V	253	3,7
Мсьціслаўская	6-V	101	—
Старадарожская	5-V	247	4,9
Жыткавіцкая	4-V	280	2,4
Менская	5-V	53	0,9
Касьцюковіцкая	6-V	44	0,4
УСЯГО па БССР		3913	2,7

Дакладны ўлік працы—

лепшы сродак укараненьня зьдзельшчыны

ПАЛЯШЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ СКОНЧЫЎ ВОРЫВА

ГОРКІ, 9.

Практычнае ўвядзеньне зьдзельшчыны ў калгасы выклікала матугны прыліў аднаасобнікаў — беднякоў і сераднякоў у калгасы. На першае мая процант калектывізацыі па раёне складаў 25,1, проц., зараз за дзевяць дзён ёсьць прырост яшчэ на 8,5 проц. і цяпер раён калектывізаваны на 33,6 проц.

Укараненьню зьдзельшчыны ў калгасах спрыяла наладжаньне ўліку працы. Новая форма нарадаў, распрацаваная на нарадзе рахункаводаў і старшынь калгасаў, даслана кожнаму калгасу. Формы працоўных кніжак замяняюцца членскімі кніжкамі былых паляводных таварыстваў (во форма працоўных кніжак яшчэ не атрымана), у якую кожнаму калгаснику сыстэматычна запісваюцца адпрацаваныя працадні.

Асабліва вялікі прыліў у калгасы ідзе ў тых сельсаветах, дзе добра праведзена зьдзельшчына і наладжан дакладны ўлік працы. У Паршыскім сельсавеце, у якім раней было калектывізавана 167 гаспадарак, у выніку ўвядзеньня зьдзельшчыны за апошнія 9 дзён уступіла ў калгасы яшчэ 128 гаспадарак. Цяпер сельсавет калектывізаваны на 43,9 проц. У калгасе «Чырвоны Настрычнік» з вёскі Паляшчыцы было 14 гаспадарак, а зараз пасьля ўвядзеньня зьдзельшчыны ўступіла яшчэ 106 бядняцка-сераднацкіх гаспадарак. Гэты калгас першым у раёне скончыў ворыва яравога кліну, а таксама набудаваў стайню на 100 штук жывёлы ў часе першамайскіх сьвят.

Шарыцкі сельсавет да ўвядзеньня зьдзельшчыны ў калгасах меў 17,7 проц. калектывізаваных гаспадарак, а зараз вялічвае —30 проц. У калгасе «Авангард» раней было 12 гаспадарак, а зараз ёсьць 66. Вёскі П'янкава і Юркава поўнасьцю калектывізаваны.

У калгас «Пабеда», Макараўскага сельсавету, уступіла 28 гаспадарак. У вёсках Андрухі і Чашніці праведзена суцэльная калектывізацыя.

Першае месца ў раёне займае Асталопаўскі сельсавет, які зараз калектывізаваны на 63 проц. Вёскі Асталопава, Канюхі, Кліматычы і Лукі цалкам калектывізаваны.

БІБЧЫКАЎ.

Камсамольцы-ударнікі

паказваюць узоры калгаснай работы

СЛУЦАК.

Чацьвертага мая калгас «Чырвоны маяк» распачаў палявыя работы. Першы дзень выезду ў поле ператварыўся ў вялікае сьвята. Калгаснікі выяжджалі ў поле добра падрыхтаванымі. Машыны і с.-г. інвэнтар упрыгожаны чырвонымі сьцяжкамі.

Уся вёска выйшла на вуліцу, каб паглядзець падрыхтаванасьць калгаснікаў. **У першы дзень работы на полі калгаснікі паказалі ўзоры гэрэічнага змаганьня за пасьпяховае скончэньне сяўбы.** На полі ўжываюцца зьдзельныя нормы выпрацоўкі. У першы дзень работы калгаснікі ўзьнялі 20 гэкт. плошчы.

Добра арганізаваная і прыкладная работа калгаснікаў выклікала новы прыліў бедняковай і сераднякоў у калгас. За апошнія дні ў калгас уступіла 5 гаспадарак.

Узорныя работы на палёх калгасаў паказваюць камсамольскія ўдарныя брыгады, якія зьяўляюцца прыкладам для ўсіх брыгад калгасаў.

Ч. Канопчык.

150 НОВЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ

выйшлі на бальшавіцкую сяўбу

АСІПАВІЧЫ, 9.

Аднаасобнікі Ляпіцкага сельсавету кідаюць старую дзедаўскую гаспадарку. Дружна арганізоўваюцца ў калгасы. Усе 39 бядняцка-сераднацкіх гаспадарак вёскі Жорнаўкі аб'ядналіся ў калгас. У вёсцы Вялікая Гара арганізован калгас з 16 гаспадарак. Усяго на сельсавеце за апошнія тры дні ўступіла ў калгасы 150 бядняцка-сераднацкіх гаспадарак. Сельсавет калектывізован на 40 проц.

У м. Ляпічы арганізаваўся прамысловы калгас з 35 сем'яў. Новыя калгасы дружна бяруцца за працу. Усе калгасы выехалі на поле. Пачынаюць сяўбу. Абяцаюць па-бальшавіцку правесьці другую бальшавіцкую вясну.

Новаарганізаваны калгас «Ударнік» учора аграмалазіў усё насеньне. Цягавая сіла ў добрым становішчы. Новыя калгасы пераходзяць на зьдзельшчыну.

У Карытнянскім сельсавеце арганізаваны тры новыя калгасы. Усяго ўступіла ў калгасы 56 гаспадарак.

У раёне арганізавана конная калёна з 20 пар коней. Заўтра конная калёна выступае ў поле на дапамогу калгасам.

Усе калгасы раёну распачалі масавую сяўбу.

Курганоў.

Аднаасобнікі руйнуюць межы

У часе сяўбы далучаюцца да калгаснікаў

ХАЛОПЕНІЧЫ. (Наш кар.).

Калгасамі раёну заарана каля 50 ПРОЦ. усёй плошчы, вызначанай пад яравы клін. На 9-га мая засеяна 200 гэкт. вікі, бульбы і аўса.

Выхад у поле адзначыўся масавым прыпывам беднякоў і сераднякоў у калгасы. ХАЛОПЕНІЦКІ сельсавет ужо калектывізаваны на 50 ПРОЦ., Кашчынскі і Жартаўскі сельсаветы — на 40 ПРОЦ.

У ГРЫЦКАЎСКІМ сельсавеце разам з калгасам беднякі і сераднякі вёскі СЛАБАДЫ выйшлі арэць калгасныя палі. На другі дзень дружнай агульнай работы 26 беднякоў і сераднякоў уступіла ў калгас. За першыя дні сяўбы прырост калектывізацыі па раёне — 3,5 ПРОЦ., зараз складае 34 ПРОЦ.

А. М.

Масавая сяўба ў саўгасах „Сьвінаводу“

РАБАЧКОМЫ НЕ РАЗГАРНУЛІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ЗА УШЧЫЛЬНЕНЬНЕ ТЭМПАЎ СЯЎБЫ

КААПЭРАЦЫЯ БССР НЯ ЗДОЛЕЛА НАЛАДЗІЦЬ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПАЛЁХ

Ня гледзячы на тое, што весткі аб ходзе сяўбы атрыманы толькі з 20 саўгасаў, можна лічыць, што саўгасы трэсту «Сьвінавод» ужо ўступілі ў масавую сяўбу. Праўда, на цяжкіх глебах саўгасы толькі выходзяць у поле.

Насеньнем і цягавай сілай забясьпечаны

Папярэднія весткі ўсё-ж даюць малюпак падрыхтаванасьці саўгасаў да сяўбы і пачатку палявых работ.

Кіраўнік беларускай канторы Сьвінаводу—тав. Аўчыньнікаў—падкрэсьлівае, што саўгасы забясьпечаны насеньнем для засеву асноўных плошчаў, за выключэньнем насеньня бульбы. Зараз забясьпечваюцца насеньнем і прырэзаныя землі.

Цягавай сілай саўгасы Сьвінаводу таксама забясьпечаны. Праўда, толькі зараз саўгасам дасланы утнаеньні, на перавозку якіх патрэбен дадатковы транспарт. Тут саўгасам павінны прыйсьці на дапамогу раённыя арганізацыі.

На словах зьдзельшчына, на справе падзёншчына

Арганізацыя працы і перавод саўгасаў на зьдзельшчыну—асноўная ўмова пасьпяховага разгортваньня сяўбы. Паводле вестак, на 26 красавіка 73 саўгасы перавялі або пераводзяць на зьдзельшчыну палявыя работы. Аднак, праверка практыкі зьдзельшчыны ў некаторых саўгасах паказвае, што ня ўсе саўгасы выканалі дырэктыву партыі. У некаторых мясцох яна выканана фармальна, а не на справе. Так, у саўгасе «ЗАРА ЗАХАДУ», ня гледзячы на неаднаразовыя запэўненьні дырэктара гаспадаркі аб тым, што работа пераведзена на зьдзельшчыну, фактычна да апошніх дзён панавала падзёншчына. Дырэктар уводзіў у зман, як кантору Сьвінаводу, так і раённыя арганізацыі, за што і зьнімаецца з работы.

Некаторыя саўгасы, як імя 1 мая, «Паўлава», «Брацькавічы», «Вайнілы», яшчэ зусім не пераявілі работы на зьдзельную аплату працы. Дырэктары гэтых саўгасаў атрымалі адміністрацыйныя спагнаньні.

Сустрэчныя нормы ўдарнікаў

У некаторых саўгасах пры вызначэньні норм раўняліся не па ўдарніках і ўвялі зьніжаныя нормы. Так, у саўгасе «Зара Захаду» на парахонным двухкорпусным плузе вызначана норма ў 0,75 гэкт., у саўгасе «Чырвоны маяк» —0,85 гэкт. Гэтыя апартуністычныя нормы ўжо скасаваны.

У саўгасе «НАСОВІЧЫ» у першы дзень выхаду ў поле ўдарнікі самі выправілі апартуністычныя нормы выпрацоўкі, устаноўленыя дырэкцыяй. **У першы дзень ударнікі замест вызначаных 5 гэкт. апрацавалі 6,8 гэкт. Ударнікі высунулі сустрэчныя павышаныя нормы.**

Рад саўгасаў адчувае недахват у рабочай сіле. Дырэктыва ЦК камсамолу аб мабілізацыі 2 тыс. камсамольцаў на работу ў саўгасы раённымі камітэтамі камсамолу выканана ў нязначнай ступені. Так, у саўгасе Імя 1 мая Менскі гарком камсамолу з вызначаных 47 чал. не паслаў ніводнага.

Рабочкомы не на чале актыўнасьці мас

У большасьці саўгасаў рабочыя адмаўляюцца ад выхадных дзён на час палявых работ і ўстанаўляюць павялічаны працоўны дзень. Ня гледзячы на працоўны энтузіязм рабочай масы, большасьць саўгасаў яшчэ не разгарнула барацьбы за ўшчыльненьне тэмпаў сяўбы. Прафарганізацыі раду саўгасаў яшчэ ня сталі на чале актыўнасьці мас, не разгарнулі сацспаборніцтва паміж плугарамі за беражлівыя адносіны да цягавай сілы. Так, з-за нядбайнасьці плугароў у саўгасе «Зара Захаду» ў першы дзень вышлі са строю 4 коні.

Рабачком саўгасу «Беларусь» на працягу больш месяца ніяк ня мог арганізаваць сустрэчы з рабачкомам саўгасу «Камунар» для падпісаньня дагавору на сацыялістычнае спаборніцтва, на лепшае і хутчэйшае праведзеньне сяўбы.

Насьцепнасэты саўгасаў таксама яшчэ не разгарнулі барацьбы за бальшавіцкую сяўбу. Так, у 10 гаспадарках упаўнаважаны беларускай канторы трэсту Сьвінавод—тав. Аўчыньнікаў пры наведваньні іх не заўважыў, каб насьцепгазэты пераключыліся на мабілізацыю рабочых саўгасу вакол задач сяўбы.

Дрэнныя прыклады работы паказваюць і паасобныя трактарысты. Так, у саўгасе імя 1 мая з-за нядбайнасьці трактарыстаў папсаваны трактар.

Недахват бульбасаджалак значна ўскладняе сяўбу бульбы ў саўгасах Сьвінаводу. Завод «Чырвоны плуг», які павінен быў адгрузіць для саўгасаў БССР 405 бульбасаджалак, не адгрузіў ніводнай.

Белкаапсаюз—у баку ад пасеўнай

Правільная арганізацыя харчаваньня ў часе палявых работ у саўгасах Сьвінаводу—важнейшая задача спажывецкай кааперацыі БССР. Паводле дагавору паміж Цэнтрасаюзам і трэстам Сьвінавод, кааперацыя павінна наладзіць грамадзкае харчаваньне ва ўсіх саўгасах, між тым, Белкаапсаюз да апошніх дзён нічога не зрабіў, каб выканаць свае абавязкі перад саўгасамі Сьвінаводу. З 80 сталовак на сёньняшні дзень адкрыты толькі 24. Гэтыя сталовыя арганізаваны нізоўкай па сваёй ініцыятыве. Белкаапсаюз гэтай справай зусім не кіруе і нават ня ведае, дзе і ў якіх саўгасах адкрыты сталовыя.

***

Позьняя вясна патрабуе бальшавіцкіх тэмпаў у разгортваньні сяўбы. Саўгасы павінны паказаць прыклад сяўбы ў скарочаных тэрміны. За пасеўную ў калгасах разам з дырэктарамі адказваюць і прафсаюзныя арганізацыі. Разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва на палёх паміж паасобнымі брыгадамі, паміж трактарыстамі, паміж плугарамі—важнейшая задача рабочкомаў.

Пляны сяўбы бульбы ва што-б там ні стала неабходна выканаць. На дапамогу саўгасам павінны прыйсьці раённыя арганізацыі і намагчы ўсе сілы для забясьпячэньня саўгасаў насеннай бульбай. Нарады на адгрузку насеннай бульбы для саўгасаў Сьвінаводу павінны быць выкананы ў бліжэйшыя-ж дні. Час не чакае.

Наркамзем БССР павінен дабіцца, каб бульбасаджалкі для саўгасаў Сьвінаводу былі безадкладна адгружаны.

Дапамагчы саўгасам вывазьці пасеўныя грузы—важнейшая задача раённых арганізацый.

Забясьпечыць саўгасы рабочай сілай—абавязак раённых камітэтаў камсамолу. Дырэктыва ЦК камсамолу аб мабілізацыі двух тысяч камсамольцаў на работу ў саўгасы павінна быць выканана ў бліжэйшыя-ж дні.

А. П—кі.

Таварныя фэрмы—без кармовай базы

У СЬМІЛАВІЦКІМ раёне паводле пляну трэба арганізаваць 15 малочна-таварных калгасных фэрм і 7 сьвінагадоўчых. Работа гэта павінна была скончыцца яшчэ 20 красавіка. Між тым, у першых лічбах мая было арганізавана ўсяго толькі 7 малочных фэрм і 3 сьвінагадоўчыя. Райкалгасаюз вельмі мала ўвагі зварачае на гэту важнейшую справу.

Вытворчыя пляны калгасаў, з якімі заключаны дагаворы, не забясьпечваюць кармамі стада малочных і сьвінагадоўчых фэрм. Гэта можа прывесьці да таго, што на будучую зіму фэрмы застануцца без кармоў.

Раённыя арганізацыі павінны зараз-жа выправіць гэтыя памылкі. Яравы клін павінен забясьпечыць патрэбу фэрм у кармох. Пад гэтым лёзунгам трэба праводзіць сяўбу ў калгасных фэрмах.

Уладзімераў.

У ЧАЧАВІЦКІМ раёне скончана заключэньне дагавораў з калгасамі аб арганізацыі малочных і сьвінагадоўчых таварных фэрм. Дагаварамі аформлена 7 малочных фэрм са стадам у 574 шт. буйной рагатай жывёлы і 7 сьвінагадоўчых фэрм са стадам у 641 шт. Укамплектаваньне фэрм яшчэ ня скончана. Райкалгасаюз недаацэньвае важнасьці гэтай работы.

К.

ЗА 12 ТАВАРНЫХ СЬВІНЕЙ

Сьвінагадоўчы саўгас «СКРЫНШЧЫНА» пачаў сяўбу падрыхтаванымі. Насеньне поўнасьцю ачышчана і адсартавана, сельска-гаспадарчыя машыны і інвэнтар адрамантаваны. Усе работы ў саўгасе пераведзены на зьдзельшчыну.

На сходзе рабочых, на якім абмяркоўваліся нормы, паасобныя цэхі саўгасу заключылі паміж сабой сацыялістычныя дагаворы. Сьвінары абавязаліся гадаваць па 12 парасят у год ад кожнай сьвіноматкі, скотнікі абавязаліся дабіцца 2.700 літраў удою ад кожнай каровы.

КІСЬЛЯКОЎ.

Усё яшчэ „плянуюць“

У Жлобінскім раёне да арганізацыі калгасных фэрм яшчэ ня прыступлена. Раней Наркамзем, Белкалгаспцэнтрам было намечана арганізаваць у раёне 4 прыгарадныя малочныя фэрмы на 500 штук і 13 калгасных фэрм на 1.000 штук. Але нядаўна прыбыла новае заданьне — арганізаваць 3 прыгарадныя фэрмы і 9 калгасных.

Райкалгасаюз, які пачаў быў складаць пляны арганізацыі фэрм, зараз зусім спыніў гэту работу.

М.

ПАНУЕ ПАДЗЁНШЧЫНА

Мазырскі ЦРК свячасова паслаў заяўкі ў райкаапсаюз і Белкаапсаюз на насеньне гародніны і траў для прыгарадной гаспадаркі. Ужо пачалася сяўба, але дагэтуль яшчэ ня прыбыло ўсё патрэбнае насеньне.

Работа ў гаспадарцы вядзецца на асновах падзёншчыны, у выніку шмат прагуляў. Склад рабочых прыгарадной гаспадаркі засьмечан кулацкім элемэнтам. Праўленьне мазырскага МЦРК павінна зараз аддаць больш увагі прыгарадной гаспадарцы, перавёўшы сюю работу на зьдзельшчыну.

Брыгада «Зьвязды».

Рабскія тэмпы

У сьвінагадоўчым саўгасе БОРКІ-БЯЛЕВІЧЫ, Чырвона-Слабодзкага раёну, да 1 мая павінна была быць скончана пабудова 2-х сьвінарнікаў на 200 сьвіноматак, 2-х рабочых баракаў і лазьні.

Але і на сёньняшні дзень будаўніцтва яшчэ ня скончана. Саўгас і Белсельбуд, які вядзе будаўніцтва, не падрыхтаваліся да прыёму рабочых-будаўнікоў. У выніку 40 ціпаўцаў і 32 цесьляры з вакольных сялян напрацавалі пару дзён і разышліся. Будаўніцтва зрываецца. Між тым, сьвіньні трымаюцца ў дрэнных умовах. У адным стайку стаіць па 2-3 паросныя сьвіноматкі. Зараз пачынаецца апарос і няма куды дзець парасят.

Белсельбуду аб гэтым ня раз ужо паведамлялі, але апошні ня ўжывае ніяк мер, каб зрушыць наперад будаўніцтва сьвінарнікаў.

Н. В.

***

У САЎГАСЕ ІМЯ 1 МАЯ яшчэ ў 1930 годзе трэба было пабудаваць сьвінарнікі на 600 штук. Але і на сёньняшні дзень Калгасбуд ня выканаў дагавору. Будаўніцтва, намечанае плянам 1931 году, яшчэ не распачата. Начальнік вучастку т. Апрыс там амаль ніколі ня бывае.

Такія адносіны Белсельгасбуду да выкананьня сваіх дагавораў не даюць магчымасьці выканаць пляны укамплектаваньня саўгасу.

Брыгада «Зьвязды».

Папулярызацыя закону аб сельска-гаспадарчым падатку выклікае прыліў у калгасы

СЯННО.

60 проц. бядняцка - сераднякіх гаспадарак Гарывецкага сельсавету ўжо аб'яднаны ў калгас. За апошнія тры дэкады мясцовым актывам, калгаснікамі і работнікамі сельсавету завербавана ў калгасы 260 бядняцка - сераднякіх гаспадарак. Вялікую дапамогу сельсавету ў справе калектывізацыі аказалі брыгады з раёну.

На сходах усіх вёсак сельсавету папулярызаваны пастановы VI зьезду саветаў і палажэньне аб сельска-гаспадарчым падатку на 1931 г. Разгорнута масавая работа з беднатой. У працы па калектывізацыі практыкуецца масавы абход і агітацыя на дварох аднаасобнікаў вярбовачнымі камісіямі калгасаў.

Сьледам за Гарывецкім сельсаветам ідуць: Латычальскі сельсавет, які калектывізаваны на 44 проц. і Ульянаўскі—на 41 проц.

ДАМБРОЎСКІ.

Зводка

аб ходзе сяўбы ў саўгасах трэсту „Сьвінавод“ на 10 мая

САЎГАСЫ	Калі пачата сяўба	Засеяна у гэктарах	Проц. выкананьня пляну
Палелюм	26-IV	57	15
Негарэлае	2-V	120	17
Зарочча	2-V	36,5	5
Вываленьне	5-V	10	1,1
Замошша		8,5	1,1
Бранчыцы	2-V	41	16
Вейна	5-V	39	9
Ялага	2-V	17	3
Паўлава		8	4
Цімкава		48	18
Усьце	3-V	2	0,6
Дрыбіна	2-V	24,5	12
Зара Захаду		7	1
Беларусь		8	2,5
Гарадок		11,5	9
Красьніца	6-V	70	19
Імя Молатава	29-IV	29	9,7
Брацькавічы	2-V	20	8
Бюнь	2-V	41,5	11,6
Насовічы	3-V	34

ГАРНЯКОУ—У ДАНБАС!

Вярбоўка праходзіць недапушчальна слаба. Плян другога кварталу выканан толькі на 48 проц. Калгасы—у абозе вярбовачнай кампаніі

Па-баявому разгарнуць работу. Разьбіць кулацкую агітацыю супроць вярбоўкі

Цьвёрда запомніць дырэктыву ЦК КП(б)Б: „Лічыць вярбоўку шахцёраў у БССР, як ударную палітычную кампанію“

Выканаць плян

Выкананьне пляну каменнавугальнай прамысловасьцю мае вялізарнейшае значэньне ў справе індустрыялізацыі нашай краіны. Увага партыі, ўраду і працоўных мас Савецкага Саюзу накіравана на гэты важнейшы вучастак фронту. Сложная лішняя тона вугалю набліжае нашу краіну да выкананьня народнагаспадарчага пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Для выкананьня пляну па здабычы вугалю неабходны кадры кваліфікаваных рабочых. Перад Савецкай Беларусьсю пастаўлена адказьнейшая задача — даць у першым квартале мінімум 5.000 дабавек працаваўшых раней у горнай прамысловасьці.

Аднак, органы Наркампрацы з гэтай задачай ня справіліся. **Плян першага кварталу выканан толькі на 48 проц.** Наркампрацы БССР ня ўсё зрабіў для дапамогі данбасаўскім вярбоўшчыкам. Ня лепш справа стаяла і з вярбоўкай рабочых у Данбас з калгасаў. Па гэтай лініі плян вярбоўкі выкананы на 12 проц.

У другім квартале плян вярбоўкі вызначан па Беларусі таксама ў 5.000 чалавек. З гэтага ліку калгасы павінны даць 2.280 чал.

Усё-ж такі, ня гледзячы на цэлы рад пастаноў ЦК КП(б)Б і СНК Беларусі, пералому ў рабоце не наступіла. **На сёньешні дзень завербавана толькі 155 чал. Ні аднаго чалавека не далі калгасы.** Падобныя калгасы нават тармозяць вярбоўку. Характэрнай у гэтых адносінах вынуглецца тэлеграма вярбоўшчыка тав. **Балаўлёва,** які піша:

— У расьпянскіх калгасах ёсьць шмат былых гарнякоў, выказаўшых жаданьне ехаць у Данбас. Праўленьні калгасаў не выдаюць дакумэнтаў на выезд.

Белкалгасцэнтр паслаў многа ўказаньняў мясцом наконт вярбоўкі, але практыка таго, як іх дырэктывы **выконваюцца,** Белкалгасцэнтр гэтым **не займаўся.** Яшчэ горш тое, што ў Белкалгасцэнтры няма **адказнай асобы** за вярбоўку шахцёраў.

Кулацтва ўсімі сіламі стараецца перашкодзіць вярбоўку рабсілы ў шахты. Яны ідуць нават на такія хітрыкі, што некаторы тэрмін пасылаюць куды-нудзь сваіх сыноў, а потым выдаюць іх, як за «прыехаўшых з Данбасу». Потым распускаюць розную роду наклёпніцкія вымыслы, даходзячы ў сваіх наглых гыпазках «да цьверджаньняў, што быццамбы ў Данбасе «прымусовая праца», вельмі няжкія ўмовы работы і г. д. У гэтай справе кулак дапамагае міжнароднаму імпэрыялізму ў яго антысавецкай кампаніі аб так званай «прымусовай працы».

Нельга не падкрэсьліць, што на мясцох гэтай кулацкай агітацыі не даецца часамі рашучага адпору. Ёсьць і такія выпадкі, дзе паасобныя працаўнікі сельсаветаў ня толькі не дапамагаюць вярбоўшчыкаў Данбасу, а, наадварот, падрываюць іх работу.

Напрыклад, **старшыня Шамаўскага сельсавету,** Мсьціслаўскага раёну, гаворыць былым гарняком:

— Сядзі дома, калі цябе не чапаюць. Калі хочаш галадаць, дык едзь (?)

У гэтым-жа раёне **старшыня Хадасоўскага сельсавету** выказаўшым жаданьне ехаць у шахты паўна адказвае:

— Я вас ня трымаю, можаце ехаць, але будзеце каяцца (?).

Вярбоўшчык тав. Кунёў залвіў аб гэтых абураючых фактах намесьніку старшыні РВК **Шэвільдзіну.** Апошні адказаў:

— Зараз такая гарачая пара. Ці варта з-за такой драбніцы выклікаць старшыць сельсаветаў? Можаш ехаць сам вербаваць рабочую сілу, калі яна табе патрэбна. Нам няма часу.

Ня дзіўна, калі бядняк **Біскуп Ф.** цэлымі **тыднямі** абівае парогі сельсавету, дабіваючыся дакумэнтаў на выезд і ня можа атрымаць іх.

Надрукаваныя сёньня намі матар'ялы сыгналізуюць аб тым, што асобныя арганізацыі ўпарта не жадаюць выканаць апошнюю пастанову Сакратарыяту ЦК КП(б)Б, дзе прапануецца зьвярнуць асаблівую ўвагу на выкрышчэньне кулацкай агітацыі, на мабілізацыю калгасных і бядняцка-сераднякіх мас вёскі, на поўнае выкананьне пляну вярбоўкі рабсілы ў Данбас.

Калгаскоры, селькоры, рабочыя-вярбоўшчыкі Данбасу павінны на месцы выявіць усе факты злачынных адносін да вярбоўкі на мясцох і праз друк моцна ўдарыць па апартуністычнай стаўцы на самацёк. Пляны вярбоўкі рабсілы Данбасу павінны быць выкананы поўнасьцю.

На Шыпцы ўсё спакойна

Па **Дрыбінскім** раёне вярбоўка рабочай сілы для Данбасу—пад пагрозай **зрыву.** Раённыя арганізацыі ў гэтай справе паказалі сваю бязьдзейнасьць. У калгасах ёсьць шмат былых шахцёраў. **Райкалгассаюз** ня даў ніякіх указаньняў калгасам па вярбоўцы гарнякоў.

Калгасьнікі дагэтуль ня ведаюць аб **ільготах,** якія даюцца тым, хто закантрактуе сябе для працы ў капальнях. Калгасы раёнаў павінны завербаваць 75 чал. Між іншым да гэтага часу завербавана ўсяго 16 чал.

Нам. старшыні райкалгассаюзу тав. Майсеенка на скліканай па ініцыятыве рабочых Данбасу нарадзе актыву заявіў:

— Ніякага прарыву на гэтым вучастку няма. Калгасы норму выканалі на 50 процантаў (?).

Пры праверцы аказалася, што ў райкалгассаюзе ніякіх вестак аб колькасьці завербаваных калгасьнікаў у капальні няма. Адкуль Майсеенка лічыў ўзяў—невядома.

Лічбы па вярбоўцы калгасьнікаў райкалгассаюз давёў з вялікім спазьненьнем. У першую чаргу лічбы даваліся тым калгасам, у якіх ня толькі былых гарнякоў няма, але і для апрацоўкі сваёй плошчы шмат рабочых не хапае.

Райпрафсавет, каб назбавіцца ад практычнай дапамогі, утварыў штаб і усклаў на яго абавязкі дапамагаць у вярбоўцы рабсілы Данбасу. Але члены штабу ніякай дапамогі пакуль што вярбоўшчыкам не аказалі.

Прэзыдыум райвыканкому ні разу не заслухаў інфармацыі вярбоўшчыка і ня ведае, у якім становішчы знаходзіцца выкананьне пляну вярбоўкі.

Кулак вядзе шалёную агітацыю супроць вярбоўкі рабочых для Данбасу. Ён распускае чуткі аб тым, нібы ў капальнях існуе «прымусовая праца».

Раённыя арганізацыі ня процістаяць кулацкай агітацыі, сыстэматычнай масава-растлумачальнай працы сярод калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіцкага сялянства. Вось чаму плян вярбоўкі гарнякоў ня выконваецца.

Вінаватых у зрыве пляну вярбоўкі рабочай сілы для Данбасу трэба прыцягнуць да адказнасьці.

Д. Д.

Райком не дапамагае

У ЧАРЭЙСКІМ раёне былых гарнякоў налічваецца каля 550 ЧАЛ.

З іх 100 чал. знаходзіцца ў калгасах. Тэрмін вярбоўкі рабочай сілы Данбасу даўно скончыўся. Аднак, на сёньешні дзень завербавана і адпраўлена ўсяго 1 чал.

Клясавы вораг вядзе шалёную агітацыю супроць паездкі ў Данбас. Кулацкія сыны выпіваюць на два тыдні з дому, а потым, пасьля прыезьдзе з Данбасу распускаюць розную хлусьню. На жаль, ня ўсюды кулацкая агітацыя устрэвае належны адпор.

РАЙКОМ КП(б)Б АДМОВІЎСЯ ДАПАМАГЧЫ ВЯРБОЎШЧЫКАМ У СПРАВЕ ВЯРБОЎКІ РАБСІЛЫ ДАНБАСУ.

Калі я прыехаў у раён, на другі дзень была склікана нарада ўпаўнаважаных, якія ехалі ў сельсаветы на паўную кампанію. На гэтай нарадзе мною была заўстрана ўвага аб мабілізацыі калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіцкай масы на барацьбу супроць кулацкай брані, падрываючай работу вярбоўкі горнарабочых.

Сакратар райкому партыі замест падтрыманьня выступіў супроць, заявіўшы:

— Вам патрэбны рабочыя, дык вы іх і вярбуйце. У нас ёсьць больш важныя справы.

Ніякай дапамогі на было і з боку райкому камсамолу. Толькі тады, калі была атрымана тэлеграма ад **ЦК ЛКСМБ,** райком распрацаваў інструкцыю ячэйкам. **Але,** на вялікі жаль, інструкцыі доўгі час валяліся ў нэшцыляры райкому. На запытаньне — чаму да гэтага часу не разаслалі інструкцыі — работнік райкому **ЛКСМБ** тав. Зайцаў адказаў:

— У нас няма машыністкі, няма каму друкаваць інструкцыі. У нас рэзалюцыі большай важнасьці не рассылаюцца толькі таму, што няма каму іх надрукаваць.

Адносіны з боку райкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ да справы вярбоўкі рабочай сілы Данбасу нельга інакш кваліфікаваць, як апартуністычную стаўку на самацёк.

Рабочы Данбасу М.

Як разумее тав Мэклер

працоўнае законадаўства

Прафработа ў МТС набывае выключнае значэньне. Яна павінна грыць выразнай, баявой рабоце МТС на правядзеньні веснавой сяўбы і калектывізацыі. Дапамога ў рабоце рабочкому МТС з боку вышэйшых прафарганізацый—важнейшая задача. Сіроцінскі райпрафсавет гэтага не разумее. Новаарганізаваны рабочком аказаўся бяз усякай дапамогі з боку райпрафсавету. Ніякай работы па мабілізацыі работнікаў МТС вакол выкананьня вытворчага пляну не праведзена. Культывыхаваўчая работа не наладжана.

Райпрафсавет, замест дапамогі ў рабоце, зрывае яе. Такі выпадак меў месца 1 мая.

Як вядома, неабходнасьць баявой падрыхтоўкі да выхаду ў поле выклікала ўдым сярод калгасьнікаў і саўгасьнікаў, сярод работнікаў МТС. Агульны сход работнікаў Сіроцінскай МТС у мэтах ліквідацыі прарыву і змацненьня падрыхтоўкі да выхаду ў поле, у мэтах забесьпячэньня посеву 3 мая трох трактарных атрадаў у поле пастанавіў адпрацаваць 1 і 2 мая. Гэты ўзор высокай сьвядомасьці работнікаў МТС, зразумела, ніколі не супярэчыў існуючым законапалажэньням аб працы. Аднак, у гэтым старшыня Сіроцінскага райпрафбюро Мэклер угледзеў незаконнае дзеяньне з боку мясцовых арганізацый МТС. **Мэклер** зьявіўся 1 мая ў кантору МТС і, не запытаўшыся ў дырэктара—чаму сабраліся работнікі МТС на работу, прапанаваў апошнім разыйсьціся, пагражаючы пры гэтым дырэктару штрафам і арыштам за такое «парушэньне законадаўства». Такім чынам **Мэклер** сарваў неадкладную работу МТС, сарваў выхад у поле трох трактарных калён 3 мая. У выніку гэтага-ж МТС была пазбаўлена магчымасьці выгрузіць 13 новых трактараў, якія прыбылі ёй на чыгунку 2 мая.

Зусім законна старшыня рабкому і дырэктар МТС у сваёй адносіне ў ЦП саюзу, ЦСПСБ і рэдакцыю газэты «Зьвязда» абураюцца такім галавацяпствам старшыні райпрафсавету і патрабуюць прыцягненьня яго да адказнасьці за зрыў работы МТС, за парушэньне партыйных дырэктыў, якія катэгарычна забараняюць умешвацца ў аперацыйную работу дырэктара МТС.

Аб фанабэрыстай прыказчыцы

Факт дробны і, бадай, ня ім ня варта было-б затрымлівацца увагу чытача, калі-б гэты факт ня быў зьвязан з такім вялікім пытаньнем, як абслугоўваньне нашым гандлёвым апаратам спажыўца—рабочага і служачага. Аб тым, што паводзіны часткі крамных работнікаў ЦРК у адносінах да рабочых-пайшчыкаў не знаходзяцца на належнай вышыні — усім вядома. Гэта частка работнікаў прылаўку ўсё яшчэ лічыць, што не яны для пайшчыка, **а пайшчык для іх.** І калі яны адпускаюць пайшчыку тавар, дык пайшчык павінен абавязкова іх падзякаваць. Не сакрэт, што да гэтага часу ня вышчаны канчаткова грубыя адносіны некаторай часткі прадаўцоў да пайшчыкаў у магазынах ЦРК, хоць у параўнаньні з мінулымі гадамі ёсьць вялікі зрух, упесены ў асарторэшчна работнікаў прылаўку сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам.

Зараз на Савецкай вуліцы адкрыўся магазын Белдзяржмагу — магазын вольнага продажу прадуктаў. Магазын абслугоўвае самы рознастайны кантынгент пакупцоў. **Апарат** магазыну павінен працаваць, як **савецкі апарат.** Адносіны да пакупцоў павінны быць **далікатнымі, вытрыманымі,** вялізарны попыт (у магазыне заўсёды чарга) павінен здавальняцца хутка, выразна, бяз лішняй мітусьні і лішніх слоў. Бо, паўтараем, магазын **савецкі,** дзяржаўны.

Аднак, на апарат магазыну ёсьць ужо рад скаргаў. Мелі месца некалькі фактаў грубых адносін да пакупцоў, грубых адказаў.

Апошні факт зусім абураючы. Гэта было 8 мая. Рабочы лямцавай фабрыкі тав. Пісман прыйшоў у магазын за папяросамі. Стаў у чарэ, атрымаў пачку папяроў і папрасіў з 10 рублёў рэшты. Прыказчыца **Вайнэр** яму рэзка адказвае — «рэшты няма».

— Вось-жа ў вас на прылаўку дробныя грошы...

— Гавораць вам, што рэшты няма.

— Ну што-ж, я пачакаю пакуль набяжыць,—спакойна сказаў тав. Пісман.

— **Тут вам не ЦРК, няма чаго распараджацца,** — кінула яму са злосьцю Вайнэр.

— Дазвольце, але вы ў Савецкім Саюзе жывяце...

Тут ужо Вайнэр канчаткова ўскіпела.

— **Хамская морда, напляваць мне на вас,** — крыкнула яна.

Вось і ўсё.

Але ў гэтай гісторыі ёсьць яшчэ адзін цікавы момант.

— **Тут вам не ЦРК,** — заявіла рабочаму Вайнэр.

У гэтай фразе даволі ярка выяўлена адна «ўстаноўка», па якой трэба моцна ўдарыць. ЦРК, бачыце, гэта для пайшчыкаў, для **рабочых,** а ў магазын Белдзяржмагу — калі прыходзіць пакупец **у рабочай вопратцы,** дык да яго можна адносіцца з грубасьцю. Не дарма прыказчыца Вайнэр **звольнілася з ЦРК** і пайшла працаваць у гэты магазын.

Белдзяржмаг створан для ўзмацненьня мабілізацыі сродкаў насельніцтва і выкананьня фінансавага пляну краіны. Таму прадпрыемствы Белдзяржмагу павінны працаваць з поўнай адказнасьцю за ўскладзеную на іх задачу і бязьлітасна вытручаць усе элементы, якія перашкаджаюць пасьпяховай рабоце.

П.

Ліквідаваць бяспрытульнасьць студэнтаў дзяржаўных драмкурсаў

Патрабуем ад органаў РСІ тэрміновага высьвятленьня справы і прыцягненьня да адказнасьці вінаватых

Сёлета адкрыліся і пачалі сваю работу апнагадовыя беларускія драматычныя курсы. Яны маюць на мэце падрыхтоўку новых пралетарскіх кадраў для нашых дзяржаўных тэатраў. Але, як відаць, гэтыя курсы выпалі з поля ўвагі адпаведных устаноў і арганізацый і апынуліся бяз усякага падтрыманьня. Ня работа курсаў зараз—пад рэальнай пагрозай зрыву.

Праўленьне курсаў, ад імя ўсяго калектыву, зьвярнуўся да рэдакцыі «Зьвязды» са спэцыяльным лістам, дзе ён просіць як-небудзь дапамагчы курсантам.

— Наша надзвычай дрэннае становішча, — гаворыцца ў лісьце, — прымушае нас зьвярнуцца да газэты за тэрміновай дапамогай... Дзесяткі рабочых і калгасьнікаў, прынятых на адпагадовыя драмкурсы, і па гэты час без інтэрнату. Студэнты начуюць на вакзалах, сквэрах і вуліцах. Былі выпадкі, калі адміністрацыйныя органы затрымлівалі студэнтаў, як бяспрытульных.

Частка студэнтаў захварэла.

Заняткі рэльмі часта зрываюцца з прычыны таго, што студэнты ня маюць месца для падрыхтоўкі да лекцый. Дыракцыя курсаў ня раз зварочвалася за дапамогай да ўсіх арганізацый, але-ж дапамогі нідзе не атрымала. Выдача стыпэндыі затрымліваецца.

У той-жа час недзе па Гандлёвай вуліцы (дом № 3) ёсьць былая сынагога, якую можна было-б скарыстаць пад інтэрнат. Мы просім дапамогі адпаведных арганізацый, а таксама зьвяртаем увагу РСІ на гэту абураючую справу.

Становішча сапраўды самае сумнае. З пралетарскімі кадрамі ў нас асабліва дрэнна іменна на гэтым адказным вучастку культурнага будаўніцтва.

Трэба, як мага хутчэй ліквідаваць бяспрытульнасьць студэнтаў драматычных курсаў, забясьпечыць ім належныя ўмовы для пасьпяховай вучобы! Неабходна прыцягнуць да суровай адказнасьці вінаватых у гэтым бяспрытульстве.

ЮР.

На дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня

Рабочыя і служачыя 1-ай ДЫСТАНЦЫІ ДАРОЖНА-БУДАЎНІЧАГА КІРАЎНІЦТВА пастанавілі адлічыць АДНАДЗЕННЫ ЗАРАБОТАК У ФОНД дапамогі пацярпеўшым ад зямлятрасеньня ў Закаўкаскай ССР. Рабочыя выклікалі пасьледваць іх прыкладу супрацоўнікі канторы нараба 4 і астатнія дыстанцыі.

***

Калектыў супрацоўнікаў СНК БССР сабраў па падпісным лісьце 215 руб. на дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня і выклікае супрацоўнікаў ДПУ, НКСнаб, БЕЛКААПСАЮЗ, ДЗЯРЖПЛЯН, НКФ і ДЗЯРЖБАНК.

***

Агульны сход ФІНАНСАВА-БАНКАЎСКІХ РАБОТНІКАЎ СМАЛЯВІЦКАГА РАЁНУ пастанавіў адлічыць аднадзенны заработак пацярпеўшым ад зямлятрасеньня. Арганізаван падпісны ліст сярод наведвальнікаў фінансава-банкаўскіх устаноў. Агульны сход выклікаў пасьледваць іх прыкладу калектыў фінансава-банкаўскіх работнікаў МЕЖАНСКАГА раёну.

***

АРГКАМІТЭТ УСЕБЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА «ПРЫХІЛЬНІК ДЗЯЦЕЙ» прапанаваў усім раённым і гарадзкім таварыствам «Прыхільнік дзяцей» у тэрміновым парадку ўключыцца ў кампанію дапамогі пацярпеўшым дзецям ад зямлятрасеньня ў ЗСФСР.

Назначэньне

Савет Народных Камісараў БССР назначыў тав. **Паўлоўскага, Я. В.,** кіраўніком Беларускага Тэлеграфнага Агэнцтва — «БЕЛТА».

Ліквідацыя падрыхтоўчай камісіі СНК БССР

Пастанова СНК БССР

У адпаведнасьці з пастановаю СНК СССР ад 11 студзеня 1931 г. «Пра ліквідацыю падрыхтоўчай камісіі пры СНК СССР (З. З. СССР 1931 г., № 4, арт. 48) Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Ліквідаваць падрыхтоўчую камісію СНК БССР.

2. Даручыць кіраўніцтву спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету ня прымаць на разгляд Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету пытаньняў, якія могуць быць вырашаны кіраўнікамі народных камісарыятаў ці іншых устаноў самастойна або згодаю кіраўнікоў зацікаўленых ведамстваў паміж сабою.

3. Абавязаць народных камісараў і кіраўнікоў самастойных устаноў БССР устанавіць у падпарадкаваных ім органах строгую пэрсанальную адказнасьць пасобных работнікаў за выкананьне ў тэрмін заданьняў ураду ці данага народнага камісарыяту (установы) і разам з тым максымальна скараціць камісійную работу.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР. С. КАНДЫБОВІЧ.

У якасьці рабочых вярбуюць... кулакоў

ВУЛА. (Наш кар.).

Упаўнаважаныя САЎГАСУ ІМЯ ВАЛАДАРСКАГА па вярбоўцы рабочай сілы ў Луськім раёне, Ленінградскай вобласьці — ГЛОРЭС і ПЯТУХОЎ—без дазволу органаў Наркампрацы завербавалі ў якасьці рабочых для саўгасу кулакоў, вычышчаных з калгасаў, а таксама саўгасьнікаў без дазволу праўленьняў саўгасаў. Кулакі ў саўгас ўжо выехалі. Адпаведныя органы павінны зацікавіцца гэтай справай.

МІКУЦКІ.

Аб гэмэралёпах

Справа была ў мінулым годзе.

Чашніцкі калгас **«Перамога»** парашыў арганізаваць племянную птушніцкую гаспадарку. Каму-ж даручыць такую справу, як не Пахомаву, энтузіясту і аматару птушніцтва?

Пахомаў — настаўнік Чашніцкай сямігодкі, аматар птушніцкай справы, працаваў у калгасе старшынёй рэвізыйнай камісіі. Праўленьне калгасу вынесла пастанову аб адводзе вучастку зямлі, будынку, набыцьці абсталяваньня. Было вырашана забясьпечыць птушніцкую галіну гаспадаркі наседкамі і кармамі. На першыя кроўі працы племянной птушніцкай гаспадаркі было адпушчана 1.500 рублёў.

Закіпела работа. Пахомава камандыравалі ў Горкі ў сельска-гаспадарчую акадэмію за яйкамі ад племянных птушак.

Прабеглі лічаныя дні, і чашніцкія фурманы ўрачыста прывезьлі ў мастэчка тав. Пахомава, разам з вялікім багажом яек, прызначаных для інкубацыі.

Дзеля таго, што ў Чашніках інкубатараў навейшай канструкцыі ня было, першай выводкі нарашыла скарыстаць інкубатары мясцовай пароды—квактух чашніцкай гадоўлі. Наседак купілі па бліжэйшых вёсках. І ад таго, што купляў кожны па сваім гусьце—наседак так і ня купілі. Лепш за ўсіх вызначыўся член праўленьня калгасу тав. Лісоўскі, які замест наседак па дарозе на ўсе грошы пакупіў сена, а наседак ня купіў. Іншыя ўпаўнаважаныя наогул нічога ня купілі.

Племянныя саўгаскія куры

Надышоў гарачы час. Псаваліся яйкі без наседак. А наседак ня было. У тыя дні на сьценках чашніцкіх хат зьявіліся абвесткі, у якіх даводзілася да ведама, што птушніцкае таварыства прымае наседак на пракат. Так, пры дапамозе пракатных квактух было выведзена 132 кураняты, качанят і індычанят. 38 курэй уласных, пахомаўскіх, былі далучаны да агульнай чарады.

А праўленьне калгасу тым часам зусім забыла пра існаваньне сваёй-жа птушніцкай гаспадаркі. І калі для новага курынага вывадку былі патрэбны кармы, праўленьне вечкана вырашыла: птушкам кармоў не адпускаць.

Пахомаў хадзіў ў райвыканком прасіць зямлі для гаспадаркі. На заяву аб водпуску кавалка зямлі загадчык РайЗА Паўлоўскі размашыста наклаў рэзалюцыю: **«Пад такое глупства, як курыцы, гароду ня дам».**

Ці варта спрачацца з тав. Паўлоўскім — дзе рабіліся больш глупства: ці ў арганізацыі племянной птушніцкай гаспадаркі, ці ў адносінах да яе з боку райза, калі-б на гэтым глупстве спынілася? Але-ж на другі дзень райвыканкомаўскі кур'ер прынёс паперку на імя Пахомава.

— Неадкладна ,—прапанаваў райвыканком, — перавесьці племянную птушніцкую гаспадарку з межаў мястэчка...» А ў нізе подпісы старшыні РВК і заг. райза.

У райКК-РСІ, куды прышоў Пахомаў са скаргай на бязглуздае дзейнічаньне райвыканкому і на адсутнасьць дапамогі з боку райкалгассаюзу і калгасу, таксама ніякіх мер не прынялі.

Прайшоў год, а ў Чашніках, як і раней, настаўнік Пахомаў з-за адсутнасьці памяшканьня трымае ў сваім пакоі, дзе жыве і яго сям'я, малых дзяцей—паўтарасоценную птушыную армію. Як і год таму назад, так і цяпер, Пахомаў разам са сваёй жонкай зьбіраюць усюды рэшткі яды, каб карміць птушак. Як і раней, калгас «Перамога» ўпарта не жадае прызнаваць свайго бацькаўства над племянной птушніцкай гаспадаркай імя народжанай. Як і раней, у адносінах да племянной птушніцкай гаспадаркі чашніцкія раённыя ўстановы — райкалгассаюз і райвыканком — адносяцца фармальна, бюракратычна, а райКК-РСІ імкнецца гэтага не заўважваць. Як і раней, над незаконнай племянной птушніцкай гаспадаркай вісіць пагроза высяленьня за межы мясцовічка. Як і раней, чашніцкія гэмэралёпы спыняюць вялікія дырэктывы, у якіх заклікаюць выканаць дырэктывы аб разьвіцьці жывёлагадоўлі.

Гэмэралёпія—ці, як яе прасьцей называюць, курыная сьлепата. «Гэмэралёпія, ці курыная сьлепата—расстройства зроку, які пры дзённым сьвятле здавальняючы, а пад вечар становіцца слабым. Гэмэралёпія — абумоўліваецца «тупасьцю» сятчаткі... хранічная гэмэралёгія — выключная хвароба **(мапы энцыклёпэдычны споўнік, стар. 1126-ая, том 1-шы, Брокгаўз і Эфрон, 1907 г. выданьня).**

У справе з арганізацыяй і работай племянной птушніцкай гаспадаркі ў Чашніках ёсьць поўнасьцю ўсе сымптомы храчнай гэмэралёпіі ў рабоце і райкалгассаюзу, і райвыканкому, і райКК-РСІ. У посьбітаў гэмэралёпіі, чашніцкіх гэмэралёпаў, гэта хвароба яшчэ тым больш небясьпечна тым, што нават пры дзённым сьвятле, добра ведаючы дырэктывы партыі, яны з-за тупасьці сваёй сятчаткі не дапамаглі праз увесь час у арганізацыі буйной калектыўнай племянной птушніцкай гаспадаркі.

Справа абмяжоўваецца ня толькі адной гэмэралёпскай гісторыяй у Чашніках. Гэмэралёпы ёсьць ня толькі ў Чашніках. Але гэмэралёпаў ня можа і не павінна быць.

Нашы часы іменна і геніяльныя тым, што зараз, як ніколі, творчыя здольнасьці і сілы кожнага працоўнага могуць быць з посьпехам скарыстаны ў справе вялікага будаўніцтва. Пры вялікім напружаньні творчых сіл, нам, як ніколі, зараз патрэбен кожны атам ініцыятывы і здольнасьці, нам патрэбны тысячы і сотні тысяч Пахомавых — энтузіястаў сваёй справы. Мы маем поўнае права катэгарычна патрабаваць ад нашых арганізацый і ўстаноў не патарпідзівых чыноўніцкіх адносін і прабываньня ў ролі пасыўных назіральнікаў, а сапраўднай дзейнай дапамогі ў кожным праўленьні энтузіязму, што ідзе на нашу-ж карысьць. Не залязаньне ў бюракратычную шкарлупу канцылярый, а сапраўдная пічыльная сувязь з масамі, кіраўніцтва імі, сапраўднае і правільнае правядзеньне дырэктыў партыі—будуць падрываць тыя карэньні, на якіх могуць вырастаць гэмэралёпскія справы.

Таму і трэба сёньня з усёй рашучасьцю пагутарыць аб гэмэралёпах в чашніцкіх раённых установах—РВК, райкалгассаюзу і, асабліва, чашніцкай райКК-РСІ.

АЛ. ЛІПНЕВЫ.

Максымальную рацыяналізацыю— у выдаткаваньні паперы

ПАСТАНОВА КАЛЕГІІ НК РСІ БССР

1. Канстатаваць, што ў выніку работы Аргбуду за першы квартал 1931 году па цэнтралізаваным абслугоўваньні ўстаноў друкаваньнем і забесьпячэньнем формамі і бланкамі — ёсьць пэўныя дасягненьні, асабліва ў галіне больш рацыянальнага мантажу форм і больш мазгазднага скарыстаньня і эканоміі паперы (карткі НКФ, НКЗ, ЦКК-НК РСІ і г. д.).

2. Адзначаючы, што ў сучасны момант ёсьць рад труднасьцяй у справе бесьперабойнага забесьпячэньня паперай, разам з гэтым канстатаваць наяўнасьць зусім ненармальнага становішча, калі да гэтага часу камітэтам па справах друку і Белдзяржснабам яшчэ ня вылучан і не размяркован фонд паперы на другі квартал.

ПРАПАНАВАЦЬ:

3. Камітэту па справах друку пры СНК БССР і Белдзяржснабу тэрмінова прыняць усе захады да неадкладнага ўстаўленьня своячасовага атрыманьня фонду паперы па кварталах і прыступіць да яе разьмеркаваньня, вызначыўшы з гэтага фонду пэўную колькасьць паперы Аргбуду для патрэб мясцовых арганізацый, якія абслугоўваюцца апошнім цэнтралізаваным забесьпячэньнем.

4. АРГБУДУ працягваць далейшы ахоп новых устаноў цэнтралізаваным забесьпячэньнем, устанавіўшы сумесна з камітэтам па справах друку сьпіс, лік і чарговасьць гэтых устаноў.

5. У мэтах больш эканомнага выдаткаваньня паперы і далейшага ўпарадкаваньня справы друкаваньня форм непасрэдна друкарнямі для ўстаноў, якія яшчэ не абслугоўваюцца Аргбудам, — прапанаваць Белпаліграфаб'яднаньню даць паказаньне друкарням прымаць у друк толькі тыя формы, на якіх будзе віза Аргбуду. Аргбуду распрацаваць парадак папярэдняй візоўкі матар'ялу, якія друкуюцца ў друкарнях, не падпарадкаваных Белпаліграфаб'яднаньню.

6. Пастанову гэту абвясьціць у друку.

Народны камісар РСІ БССР

КАЛНІН.

Паведамленьні

— Сьпіс дакладчыкаў, выпучаных Менгаркомам КП(б)Б на правядзеньні дакладаў на прадпрыемствах аб дні друку: Курцік—зав. імя Варашылава, Красіна—«Камунар», Будзінскі—«Бальшавік», Мітлін—«ДА», Фуксон—«Беларусь», Вержбаловіч—«Ударнік», Ізоч — шклозавод, Чарнякоў — Хэмфармзавод, Сухараў — Сьпіртзавод, Платаў—Хлебазавод, Цыпкін—малочны зав., Задескі—«Чырв. Хэмік», Кучынскі—«Пралетары», Паўлоўскі—«Чырв. Зорка», Дунец—ф-ка «Кастрычнік», Бер—абутк. ф-ка, Газініынікава—шчотачн. ф-ка, Любін—«Беларуская», Шастакоў — «Камунарка», Праўда—«Чырв. Тэкстыльшчык», Анісаў—шчацін. ф-ка, Дамесік—скарняжн., Палічанскі — шпалерн., Беразоўская—ф-ка 8 сакавіка, Левіна — рымарная, Тоўсьцік—ф-ка імя Крупскай, Мядзьведзеў — лямцавад, Гінзбург — каўбасн. камб., Слонім — Эльвод, Некрашэвіч—друк. імя Сталіна, Улазаў—Палата Мер і Вагі, Карачун—абутк. майст., Жабінскі—Менхладбойня, Орліс—Упільскую, Кіртэйн—каап. прадпр. харчавікоў, Цілпіра—яч. харчавікоў, Угараў ЦПІ, Фадотаў—БСІКА, Лісковец—ВЭА, Пракошка—БСПС, Гаеўскі—цагі, Будзін—«Полымя Рэвалюцыі», Лынькоў—Шлях, Старавойтаў — Транспартгрэст, Бучукуо — УМТ, Дубавіцкі—Саюзтранс, Сенчук—Эксплёатацыя, Сэрбэнта — Белдзяржбуд, Фрыдман—Менбуд, Розіна — Будадда. МЦРК. Рэзэрвовымі дакладчыкамі вылучаюцца т. т.: Александровіч, Гуревіч, Юргелевіч, Цітовіч, Кулішэнка, Лібензон, Балашэўскі, Ракаў, Кананаін, Бялута, Трус. Кансультацыя—у Доме Камасьветы, пакой № 19, 16-га мая ў 7 гадз. веч.

— Партыйная Мен. гарКК КП(б)Б выклікаецца на пасяджэньне П. Т. 15-га мая г. г., у 6 гадз. веч. (Энгельса 28, 2-гі паверх) наступныя т. т.: Селязнёў П. Ф. (Белсаўгастрэст), Фітэрштэйн Н. Х. (ф-ка «Кастрычнік»), Маркага (ф-ка «Беларуска»), Сазонаў (зав. «ДА»), Апаніч М. (чыг. ахова), Раманоўскі М. (Каладзішчанская яч.), Малашонак З. К. (Новадворская яч.), Адлерштэйн І. (зав. «ДА»), Прусьніц М. М. (Камвуа), Пасьпяшылаў І. В. (абутк. ф-ка), Зайнава (Мустэхнікум), Гінзбург З. К. (Мэталяўстановы), Русакоў У. (б. Самахвалаўскі р.), Малашонак (курсы горн. тэхн.), Рудзінскі (каўбасная ф-ка), Гурэцкі І. Ф. (ЦП Працмастацтва), Чарленак А. К. (яч. НКЮ), Зеленка Я. Я. (саюз нарчарчаваньня), Конанава Н. В., Батура, Барламаў А. Т. (б. Астр.-Гарадзецкі р.), Трыбуц М. К. (ЖАКТ № 1), Одар В. Л., Мікуліч А. В., Александровіч Я. С., Зельдовіч С. Л., Гельмановіч, Гуткін І., Ледзян Ф. С., Табачнікаў С. Ю.—для ўдзелу ў разглядзе справы. Таксама павінны зьявіцца сакратары ячэек, дзе гэтыя т. т. лічацца на вучоце.

— Сёньня, 13 мая, у 7 г. в. у памяшк. ЦК МОПР'у БССР (Савецкая, 87) адбудзецца чарговае пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР.

— На 15 мая 1931 г. у 7 г. веч. павінны зьявіцца грамадзкія інспэктары, «лётчыя кавалерысты» і актыў, які працуе ў бюро скаргаў ЦКК-РСІ. За своячасовую яўку адказасьць ускладзецца на сакратароў парт'ячэек і старшынь фабзаўкомаў. Яўка абавязкова.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Беларускі Другі Дзяржаўны Тэатр
13 МАЯ паказ для ф-кі „Кастрычнік“ Пач. у 8 гадз.
І. Гурскі
КАЧАГАРЫ
п'еса ў 4 дзеях.

„Чырв. Зорка“ Пач. 7. 8-45 і 10-30
новы амэрыканскі прыгодніцкі фільм
У АПОШНЮЮ ХВІЛІНУ
(Плыві, дзяўчына плыві)

„Культура“
З 10-V
РЭВАНШ
Зьвыш праграмы кроніка № 20.

„Інтэрнацыянал“
З 5 мая замежны фільм
ШЛЮБ аб ЗАКЛАД
Пач. 1 с. у 6 г. Каса—з 4 г. 30 м.

„Пралетары“
МОНСІ БЭННС у камэдыі
Гоншчык супроць волі
З 6 МАЯ ўсходні фільм
АЛІМ
Кіно-аповесьць у 7 частках.

„Юны Піянэр“ Пач. з 1 г. дня,
„СПАРТАК“ Пач. 7